Сямейная газета

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 ВЕРАСНЯ 2015 г. ЧАЦВЕР № 168 (28026) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Ганна Бахур з сынам вярнуліся дадому

Хвароба рэтра-аўтамабілямі

Вопыт гатавання «жывога» хлеба

ЦЫТАТА ДНЯ

Андрэй КАБЯКОЎ, прэм'ер-міністр:

«Развіццё супрацоўніцтва ў Садружнасці Незалежных Дзяржаў практычна ва ўсіх сферах, пачынаючы ад эканомікі і заканчваючы сацыяльнымі праектамі, з'яўляецца найважнейшым прыярытэтам нашай знешняй палітыкі. Рэспубліка Беларусь працягвае паслядоўна выступаць за далейшае аб'яднанне намаганняў усіх дзяржаў — удзельніц СНД у барацьбе са злачыннасцю, улічваючы, што глабалізацыя сучаснага грамадства негатыўна адбіваецца на крымінагеннай сітуацыі. Гэта абумоўлівае неабходнасць далейшага ўдасканалення практычных метадаў нейтралізацыі пагроз, пошук новых шляхоў комплекснага забеспячэння нацыянальнай бяспекі дзяржавы».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 03.09.2015 г.

Долар ЗША	17491,00	▲
Еўра	19692,00	▲
Рас. руб.	262,43	▼
Укр. грыўня	788,77	▼

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 15168

ПА ПРЫНЦЫПАХ СТРАТЭГІЧНАГА ПАРТНЁРСТВА

будзе і надалей развівацца супрацоўніцтва Беларусі і Кітая

Візіт Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Кітай прымеркаваны да ўрачыстых мерапрыемстваў у Пекіне з нагоды перамогі ў антыяпонскай вайне і заканчэння Другой сусветнай вайны. На свята ў Паднябесную з'ехаліся лідары многіх дзяржаў, але пра асабліва сяброўскі і канструктыўны ўзровень супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі сведчаць двухбаковыя сустрэчы, якія беларускі Прэзідэнт правёў у гэтыя дні ў Кітаі на самым высокім узроўні.

Фота БЕЛТА.

Падчас сустрэчы са Старшынёй Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпінам Аляксандр Лукашэнка выказаў падзяку за кітайскія інвестыцыі і крэдыты, прадастаўленыя для рэалізацыі інфраструктурных праектаў.

За кошт гэтых сродкаў у Беларусі будуюцца дарогі, прапрацоўваецца шэраг праектаў для асваення фінансаў.

Прэзідэнт падкрэсліў, што нядаўні візіт Сі Цзіньпіна ў Беларусь стаў гістарычным і прарыўным. «Сёння супрацоўніцтва вельмі эфектыўна развіваецца», — сказаў беларускі лідар.

Ужо нямала зроблена па будаўніцтве кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень». «Вы яго назвалі жамчужынай Шаўковага шляху. Гэта будзе ўнікальны праект», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы і дадаў, што там значна актывізавалася работа.

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў таксама кітайскаму боку за ўвагу, што надаецца дзяржавай памяці ахвяр Другой сусветнай вайны, у якой як Савецкі Саюз і Еўропа, так і Кітай панеслі сур'ёзныя страты.

Зыходзячы з прынцыпаў стратэгічнага партнёрства, Кітай гатовы падтрымліваць Беларусь, што адзначыў у сваю чаргу Сі Цзіньпін. «Мы гатовы і далей працаваць з Беларуссю, каб дабівацца яшчэ больш вынікаў у сумеснай дзейнасці», — сказаў Старшыня КНР. Сі Цзіньпін звярнуў увагу на тое, што беларуска-кітайскае партнёрства ўстойліва развіваецца. «Спадзяюся, што бакі будуць актыўна супрацоўнічаць для захавання высокай дынамікі адносін», — адзначыў ён. Гаворачы аб кітайска-беларускім індустрыяльным парку, Сі Цзіньпін падкрэсліў важнасць гэтага праекта. «Мы ўжо многае разам зрабілі па гэтым праекце. Спадзяюся, што сумеснымі намаганнямі мы зможам зрабіць парк узорным прыкладам ініцыятывы эканамічнага пояса вялікага Шаўковага шляху», — падкрэсліў Сі Цзіньпін.

СТАР. 2

■ Учора і сёння

ЧАС, КАЛІ МЫ МНОГАЕ ЗДОЛЕЛІ

Фотавыстава БелТА паказала, як мы жылі ў 1990-х і як жывём цяпер

Рабочая назва фотавыставы Беларускага тэлеграфнага агенцтва, што адкрылася ўчора ў кінатэатры «Масква», «Было — стала», афіцыйная — «Суверэнная Беларусь: эпоха дасягненняў». Выстава расказвае пра тое, якой была наша краіна ў пачатку 1990-х гадоў і якая яна сёння.

Прадстаўлена 50 работ: палова з іх — чорна-белыя, яны прысвечаны жыццю краіны 25-30 гадоў таму, палова — каляровыя, якія расказваюць пра сучаснае жыццё.

— Гэта ўсяго толькі частка вялікага інтэрнэт-праекта, які размешчаны на нашым сайце, — адзначыў **генеральны дырэктар БелТА Дзмітрый ЖУК.** — Там прыкладна 200 работ. Для чаго мы рабілі гэты праект? Усё вельмі проста. Памяць чалавека працуе такім чынам, што нейкія дэталі сціраюцца. А фатаграфіі дазваляюць успомніць і ўзнавіць агульную карціну. Гэтыя фотаработы вельмі добра дапамагаюць ацаніць рэальны маштаб змяненняў у нашай краіне. Асноўнай аўдыторыяй мы бачым маладых людзей, якія нарадзіліся ўжо ў суверэннай Беларусі.

Фота БЕЛТА.

Ігар БУЗОЎСКІ, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, які наведаў адкрыццё выставы, заўважыў, што гэта старт вялікай працы, якую пачынае сёння агенцтва.

Па яго словах, фотавыстава мае каласальнае значэнне для моладзі, якая з прычыны свайго ўзросту не заспела некаторыя падзеі. Архіўныя кадры карэспандэнтаў БелТА здольны нагадаць маладым людзям, як важна захоўваць і прымнажаць тое, што далося краіне велізарнымі намаганнямі і штодзённай працай старэйшага пакалення.

— Фотакарэспандэнты ў сваіх здымках дапамагаюць захоўваць гісторыю, — падкрэсліў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, — а яе ўрокі дазваляюць прымаць рашэнні, што ўплываюць на вызначэнне далейшага шляху нашай дзяржавы. Важна, каб яны былі выверaны, і нельга забывацца аб тым, што было раней.

Ігар Бузоўскі паведаміў, што з выставай пазнаёмяцца не толькі наведвальнікі кінатэатра «Масква».

— Яна стане перасоўнай, — паведаміў ён. — Пры падтрымцы БРСМ мы пастараемся, каб моладзь, як мінімум, уключылася ў працэс распаўсюджання інфармацыі пра гэтую выставу па ўсёй краіне.

Дэпутат Алена ШАМАЛЬ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы, у сваім выступленні заўважыла, што для моладзі, якая прымае ўдзел у адкрыцці выставы, усё гэта — гісторыя ў карцінках.

— А для многіх грамадзян нашай краіны, у тым ліку мяне, гэта гісторыя жыцця, — сказала яна. — Спадзяюся, выстава дазволіць нам успомніць пра тыя рэчы, якія маюць сапраўдную каштоўнасць для кожнага чалавека. Вельмі прыемна, што сёння тут столькі маладых людзей. Удвая прыемна, што сённяшняя моладзь разумее: палітыка можа аказваць уздзеянне як на паскарэнне развіцця дзяржавы, так і на замаруджванне.

СТАР. 2

ПА ПРЫНЦЫПАХ СТРАТЭГІЧНАГА ПАРТНЁРСТВА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прэзідэнт Беларусі таксама сустрэўся з першым намеснікам прэм'ера Дзяржаўнага савета КНР Чжанам Гаалі. На гэтай сустрэчы былі акрэслены пытанні, якія Беларусі і Кітаю трэба вырашыць у найбліжэйшай перспектыве.

«У вас цяпер вельмі шмат сяброў. Вы набылі іх зусім нядаўна, калі Кітай стаў адной з уплывовых краін у свеце, фактычна другім пунктам прыцягнення многіх дзяржаў нашай планеты», — адзначыў Прэзідэнт.

«Але ў Беларусі з Кітаем даўняя гісторыя. Уся навейшая гісторыя Беларусі звязана з Кітайскай Народнай Рэспублікай. Гэта значыць, што мы не сітуатыўныя сябры, не сябры ўчарашнія, а даўнія сябры кітайскага народа і паміж намі сапраўды ўстанавіліся вельмі добрыя адносіны», — сказаў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на частату сустрэч кіраўніцтва дзвюх краін. На яго думку, гэта вельмі важна для двухбаковых адносін. «Чым часцей мы будзем сустракацца, тым больш пашыраны будуць нашы адносіны, тым эфектыўней будуць рэалізоўвацца нашы дамоўленасці», — лічыць Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што беларускі бок абсалютна задавальняе сфарміраваная формула перагавораў. «Мы вызначылі адзін аднаго як стратэгічных партнёраў», — падкрэсліў ён.

«Беларусь мы заўсёды лічым надзейным, вялікім сябрам. Мы заўсёды разглядаем вас як свайго жалезнага партнёра», — падкрэсліў Чжан Гаалі. «Пад вашым кіраўніцтвам у Беларусі назіраецца палітычная стабільнасць, развіваецца эканоміка і ўвесь час павялічваецца ўзровень жыцця насельніцтва. Мы захапляемся вашымі дасягненнямі», — дадаў ён. Чжан Гаалі адзначыў, што паміж Беларуссю і Кітаем устаноўлены адносіны ўсебаковага стратэгічнага партнёрства. «І больш за тое, паміж вамі і Старшынёй КНР Сі Цзіньпінам склалася глыбокая асабістая дружба», — сказаў першы намеснік прэм'ера Дзяржсавета, падкрэсліўшы, што трэцяя сустрэча лідараў краін за такі кароткі тэрмін у чатыры месяцы — «гэта вялікая рэдкасць у сусветнай палітыцы».

Умацаванню і развіццю беларуска-кітайскага стратэгічнага ўсебаковага партнёрства заклікана спрыяць і Дырэктыва №5 «Аб развіцці двухбаковых адносін Рэспублікі Беларусь з Кітайскай Народнай Рэспублікай», якую падпісаў беларускі лідар.

Паводле БЕЛТА.

У АБ'ЕКТЫВЕ — КІБЕРЗЛАЧЫНСТВЫ

У Мінску праходзіць пасяджэнне Савета Міністраў унутраных спраў краін — удзельніц СНД

Фота Надзеі БУЖАН.

Учора прадстаўнікі дэлегацый усклалі кветкі да манумента Перамогі, а пасля правялі шэраг афіцыйных мерапрыемстваў. Сярод іх — сустрэча з прэм'ер-міністрам Беларусі Андрэем КАБЯКОВЫМ.

— У парадку дня былі прыярытэтныя пытанні ўзаемадзеяння праваахоўных ведамстваў дзяржаў СНД, — кажа Канстанцін Шалькевіч, начальнік упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС Беларусі. — У прыватнасці, супрацьдзеянне кіберзлачынствам, крадзяжам аўтатранспарту, абарачэнню новых псіхаактыўных, псіхатропных рэчываў і наркатычных сродкаў, а таксама супрацьпраўным дзеянням нефармальных аб'яднанняў спартыўных балельшчыкаў. У рамках форуму таксама адбыўся шэраг двухбаковых перамоў.

Першая сустрэча міністраў унутраных спраў краін СНД прайшла ў 1992 годзе таксама ў сталіцы Беларусі. Гэтым разам у ёй удзельнічаюць міністры і намеснікі кіраўнікоў ведамстваў Азербайджана, Арменіі, Казахстана, Кыргызстана, Малдовы, Таджыкістана, Беларусі, Расіі і Узбекістана.

Тарас ШЧЫРЫ. *taras@zviazda.by*

■ Парламенцкі дзённік

ПАРУШЭННЕ ПРАМЫСЛОВАЙ БЯСПЕКІ БУДЗЕ ДОРАГА КАШТАВАЦЬ

У Палаце прадстаўнікоў ідзе напружаная праца па падрыхтоўцы адпаведнага законапраекта да другога чытання

Учора адбылося пашыранае пасяджэнне рабочай групы па дапрацоўцы праекта закона Рэспублікі Беларусь «Аб прамысловай бяспецы». Узначальвала пошук кансэнсусу член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Вольга ПАЛІЦІКА, якая курыруе падрыхтоўку дакумента да паўторнага разгляду ў Авальнай зале парламента.

Законапраект паступіў у ніжнюю палату ў лістападзе мінулага года і ў дзень адкрыцця вясновай сесіі 2 красавіка быў разгледжаны ў першым чытанні ў аўтарскай рэдакцыі. Тады намеснік старшыні профільнай камісіі Міхаіл Пачынок інфармаваў калег, што канцэптуальных заўваг па дакументе не паступіла. Аднак з красавіка сітуацыя кардынальна змянілася.

— З таго часу ідзе напружаная праца па падрыхтоўцы дакумента да другога чытання, — паведаміла журналістам дэпутат Вольга Паліціка. — Праект выклікаў вялікі інтарэс не толькі ў дзяржорганаў, але ў першую чаргу — у прадпрыемстваў. Па ініцыятыве дэпутатаў была праведзена рабочая сустрэча з кіраўніцтвам Дэпартамента па наглядзе за бяспечным вядзеннем работ у прамысловасці Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, прадстаўнікамі шэрагу арганізацый нафтахімічнай галіны на базе ААТ «Нафтан». Месца было выбрана невыпадкова, бо гэта прадпрыемства мае шэраг небяспечных вытворчых аб'ектаў. Мы запрасілі да абмеркавання і іншыя буйныя прадпрыемствы, бо выкананне патрабаванняў закона, які рыхтуецца, пацягне працоўныя і матэрыяльныя выдаткі. Напрыклад, прапануецца замацаваць абавязковае страхаванне грамадзянскай адказнасці ў выпадку, калі небяспечны вытворчы аб'ект будзе аднесены да пэўнага тыпу небяспекі. Таму нормы будучага закона разглядаюцца ўсімі зацікаўленымі вельмі пільна, пра што сведчыць аб'ём заўваг. Мы ўнеслі шмат папраўак, аптымізавалі тэкст законапраекта.

Праца над праектам ускладняецца тым, што яна адбываецца на фоне барацьбы прадпрыемстваў за зніжэнне сабекошту прадукцыі. Пры гэтым параўнальна нядаўна быў прыняты Закон аб ахове працы, дзейнічае досыць жорсткае экалагічнае заканадаўства, і калі складасці ўсе патрабаванні названых законаў з патрабаваннямі прамысловай бяспекі, то пра зніжэнне сабекошту казаць становіцца цяжка.

— Таму, працуючы над законапраектам, мы ставім мэту, з аднаго боку, забяспечыць неабходны ўзровень бяспекі не толькі работнікаў прадпрыемства, але ўсяго насельніцтва і навакольнага асяроддзя. З іншага, усе патрабаванні новага закона павінны быць абгрунтаваныя і мэтазгодныя, — тлумачыць Вольга Паліціка.

Законапраект больш дакладна прапісвае паўнамоцтвы дзяржорганаў і суб'ектаў гаспадарання ў галіне прамысловай бяспекі. Прапануецца ўсе небяспечныя вытворчыя аб'екты да ўводу ў эксплуатацыю ўносіць у адпаведны дзяржаўны рэестр, выключэнне з якога магчыма толькі пасля вываду аб'екта з эксплуатацыі. Гэта дазволіць не страціць небяспечныя аб'екты са сферы кантролю ў выпадку, напрыклад, змены ўладальніка.

Акрамя таго, законапраект больш дакладна прапісвае падыходы да падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне прамысловай бяспекі і праверкі ведаў тых, хто эксплуатуе патэнцыйна небяспечныя аб'екты.

— Дзеючы закон быў прыняты ў 2000 годзе, з таго часу шмат чаго змянілася, — кажа Вольга Паліціка. — У нашай краіне адбываецца мадэрнізацыя прадпрыемстваў, укараняюцца новыя тэхналогіі, усталёўваецца новае абсталяванне, выкарыстоўваюцца новыя сыравінныя матэрыялы. Разам з тым, у некаторых сферах абсталяванне старэе і рызыка здарэнняў павялічваецца. Таму пытанні прамысловай бяспекі, пры ўсёй сваёй тэхнічнай складанасці, не павінны выпадаць са сферы ўвагі заканадаўцаў.

— Па вялікім рахунку, мы кажам пра ўстойлівае развіццё Беларусі: пра тое, каб будучыя пакаленні атрымалі нашу краіну ў стане, не горшым за той, якім карыстаемся мы. Гэта пытанні стратэгічныя. Патрабаванні прамысловай бяспекі будуць стымуляваць нашы суб'екты гаспадарання выкарыстоўваць найбольш бяспечныя тэхналогіі, найбольшую ўвагу надаваць абароне сваіх работнікаў ад уплыву шкодных фактараў. Бо парушэнне нормаў будучага закона будзе не толькі каштаваць, яно будзе дорага каштаваць, — дадала куратар законапраекта.

Праект закона «Аб прамысловай бяспецы» таксама прадугледжвае спасылку на нарматыўна-прававую базу Еўразійскага эканамічнага саюза.

Дэпутаты спадзяюцца прыняць законапраект ў другім чытанні падчас восеньскай сесіі.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА

■ Дапамога

Інавацыя для школьнікаў ад МАЗа

Банк развіцця плануе прафінансаваць распрацоўку новай мадэлі школьнага аўтобуса

Учора на тэрыторыі сталічнага акцыянернага таварыства «МАЗ» старшыня праўлення Банка развіцця Рэспублікі Беларусь Сяргей РУМАС прымаў удзел у перадачы 20 школьных аўтобусаў Упраўленням адукацыі Магілёўскага і Брэсцкага абласных выканаўчых камітэтаў, а яшчэ адзін аўтобус будзе накіраваны дзіцячаму дому «Сям'я».

Увогуле, перадача гэтай тэхнікі ажыццяўляецца ў межах праграмы Банка развіцця «Школьны аўтобус», якая прадугледжвае набыццё на працягу 2013-2017 гадоў не менш як 300 адзінак спецыяльна абсталяваных школьных аўтобусаў за кошт сродкаў банка.

Кіраўніцтва фінансавай установы адзначае, што аўтобусы банк купляе па конкурсе, у якім сёлета перамог МАЗ. Напрыклад, летась частка аўтобусаў, што набыў банк, была расійскай вытворчасці. «Мы разлічваем, што да 1 верасні 2017 года ў конкурсе з боку МАЗа ўжо будуць удзельнічаць новыя мадэлі, якія змогуць добра сябе зарэкамендаваць і на грунтавых пакрыццях у сельскай мясцовасці», — падкрэсліў Сяргей Румас. **Генеральны дырэктар Мінскага аўтамабільнага завода Дзмітрый КАЦЯРЫНІЧ** адзначыў, што сённяшнія мадэлі школьных аўтобусаў былі дадаткова адаптаваны для перавозкі дзяцей. Так, новая мадэль распрацоўваецца спецыяльна для школьнікаў і будзе адрознівацца павышанай праходнасцю.

За тры гады Банк развіцця ўжо паставіў больш за 130 аўтобусаў у рэгіёны. Усе 60 аўтобусаў, якія запланавалі на гэты год, будуць перададзены спажыўцам на працягу 1-й паловы верасня. «Сваю працу мы не абмяжоўваем толькі пастаўкай аўтобусаў. Спецыялісты адсочваюць іх эксплуатацыю ва ўсіх рэгіёнах Беларусі. Усе заўвагі, і станоўчыя, і адмоўныя, перадаюцца на МАЗ. Варта адзначыць, што завод да іх прыслухоўваецца і аператыўна ліквідуе недахопы», — патлумачыў пазіцыю банка Сяргей Румас.

Старшыня праўлення Банка развіцця паведаміў, што ў наступным годзе будуць заказаны аўтобусы для дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі. «Такія заяўкі былі ў нас і сёлета, але мы іх не задаволілі. Налета банк плануе паставіць у рэгіёны менавіта такія аўтобусы», — упэўнены Сяргей Румас. Да асноўных пераваг школьнага аўтобуса сталічнай вытворчасці можна аднесці дадатковыя сістэмы бяспекі для дзяцей і кіроўцы, а таксама прымяненне ў канструкцыі пнеўмападвескі. У салоне размяшчаюцца 22 месцы для сядзення. Усе яны абсталяваны рамянямі бяспекі. На аўтобусе ўсталяваны праблескавыя маячкі, знешняя гучнай сувязь, высоўная прыступка. Тэхніка абсталявана таксама сістэмай абмежавання хуткасці да 60 км/г і пазначана спецыяльным надпісам «Школьны».

Сяргей Румас паведаміў, што айчынны Банк развіцця ў сваёй працы надае вялікую ўвагу палітыцы сацыяльнай адказнасці. Не толькі фінансавыя і інвестыцыйныя, але і спонсарскія праекты банка накіраваны на развіццё эканомікі краіны і павышэнне якасці жыцця яе грамадзян. Ён перакананы, што рэалізацыя праграмы «Школьны аўтобус» дазволіць стварыць умовы для роўнага доступу дзяцей, якія пражываюць у сельскай мясцовасці, да адукацыйных паслуг і будзе спрыяць умацаванню матэрыяльна-тэхнічнай базы сельскіх установ адукацыі.

Асобна старшыня праўлення паведаміў, што Банк развіцця выступіў з ініцыятывай прафінансаваць распрацоўку прынцыпова новай мадэлі школьнага аўтобуса. Канструктары МАЗа працуюць над ёй. Прагназуецца, што да вясны 2016 года доследны ўзор такога аўтобуса, які будзе перададзены ў Віцебскую вобласць, будзе гатовы.

Сяргей КУРКАЧ.
kurkach@zviazda.by

ЧАС, КАЛІ МЫ МНОГАЕ ЗДОЛЕЛІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На адкрыцці прысутнічаў і адзін з аўтараў прадстаўленых на ёй здымкаў — **фотограф Аляксандр ТАЛОЧКА,** які прыйшоў на працу ў БелТА яшчэ ў 1981 годзе.

— Мы патроху пачынаем забывацца на тое, што было раней, і скардзімся на жыццё, — адзначыў фотограф у гутарцы з журналістамі. — Старэйшае ж пакаленне па-сапраўднаму шануе тое, што ёсць у іх цяпер. За 25 гадоў жыццё беларусаў моцна змянілася, яны сталі больш упэўненымі ў заўтрашнім дні і захацелі жыць яшчэ лепш, што з'яўляецца цалкам натуральным для людзей.

Пасля ўрачыстага адкрыцця выставы там жа, у кінатэатры, прайшлі адкрытыя маладзёжныя дэбаты «Выбірай.by!» на тэму «Як было, і як стала». У дыскусіі прынялі ўдзел студэнты Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце і члены Маладзёжнай палаты 4-га склікання пры Мінскім гарадскім Савеце дэпутатаў.

Моладзь абмеркавала перамены, якія адбыліся ў краіне з моманту атрымання статусу суверэннай дзяржавы, дынаміку развіцця беларускага грамадства, асноўныя дасягненні сучаснай Беларусі.

У якасці незалежных экспертаў выступілі генеральны дырэктар БелТА Дзмітрый Жук, дэпутат Алена Шамаль і першы сакратар ЦК БРСМ Андрэй Белякоў.

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

ІПЧ «ЖЫЛЛЁ» ПРАІНДЭКСАВАЛІ Ў СТАЛІЦЫ

Цяпер гэтая каштоўная папера наміналам у 1 чэк каштуе амаль 170 тысяч рублёў

Індэкс росту кошту будаўніцтва жылля ў параўнанні з яго цаной на 31 снежня 1991 года для індэксацыі чэкаў «Жыллё» ўстаноўлены ў памеры 169 015,6. Нагадаю, што гаворка ідзе пра выкарыстанне чэкаў «Жыллё» грамадзянамі і членамі іх сем'яў, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, для аплаты паявога ўзносу ў жыллёвым або жыллёва-будаўнічым кааператыве, фінансавання індывідуальнага або калектыўнага жыллёвага будаўніцтва, рэканструкцыі аднакватэрных блакіраваных жылых дамоў, долевага ўдзелу ў жыллёвым будаўніцтве, набыцця жылля шляхам куплі, а таксама для пагашэння запазычанасці па крэдытах банкаў (уключаючы выплату працэнтаў за карыстанне імі) і пазыках юрыдычных асоб, узятых і выкарыстаных з гэтымі мэтамі.

1 чэк пры разліку будзе прыраўнаваны да 169 015,6 рубля. Прыватызацыйныя чэкі ў розных рэгіёнах каштуюць не адналькава. Індэкс росту кошту чэкаў «Жыллё» зацвярджаецца самастойна аблвыканкамамі і Мінгарвыканкамам.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

ДЫРЭКТЫВА №5

«АБ РАЗВІЦЦІ ДВУХБАКОВЫХ АДНОСІН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ З КІТАЙСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКАЙ»

Развіццё адносін усебаковага стратэгічнага партнёрства Рэспублікі Беларусь з Кітайскай Народнай Рэспублікай (далей — КНР) адпавядае доўгатэрміновым інтарэсам Беларусі, умацаванню яе міжнародных пазіцый, спрыяе забеспячэнню развіцця ўсяго спектра беларуска-кітайскага супрацоўніцтва.

Асноўным зместам беларуска-кітайскага супрацоўніцтва з'яўляецца ўзаемная рашучая падтрымка па пытаннях, якія датычацца карэнных інтарэсаў дзвюх краін, такіх як суверэнітэт, тэрытарыяльная цэласнасць, бяспека і эканамічнае развіццё.

З мэтамі развіцця адносін усебаковага стратэгічнага партнёрства Рэспублікі Беларусь з КНР:



1. Устанавіць, што супрацоўніцтва з КНР ажыццяўляецца на аснове наступных прынцыпаў:

раўнапраўе і ўзаемная выгада;

прымяненне пераважна рынкавых падыходаў з улікам інтарэсаў Рэспублікі Беларусь;

прыярытэтнасць, доўгатэрміновасць рэалізуемых праектаў, паслядоўнасць іх рэалізацыі;

прамое і цеснае ўзаемадзеянне рэспубліканскіх і мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання з кітайскім бокам;

адказнасць суб'ектаў гаспадарання за эфектыўнасць рэалізацыі праектаў узаемавыгаднага супрацоўніцтва з КНР.

2. Вызначыць наступныя асноўныя напрамкі супрацоўніцтва з КНР:

глыбокая і ўзаемная інтэграцыя галін і прадпрыемстваў;

інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі;

фарміраванне сумесных даследчых і навукова-практычных цэнтраў, сумеснае развіццё галіновай навукі;

прамое і сістэмнае міжрэгіянальнае супрацоўніцтва;

стварэнне ў Рэспубліцы Беларусь рэгіянальнага цэнтра кітаязнаўства і ўзаемадзеяння з КНР.

3. Лічыць мэтавым напрамкам супрацоўніцтва з КНР сумеснае развіццё ў гандлёвай, інвестыцыйнай, фінансавай і інавацыйнай сферах, стварэнне і рэалізацыю сумесных праектаў і прадпрыемстваў.

Каардынацыйным органам садзейнічання развіццю адносін з КНР лічыць Беларуска-Кітайскі міжурадавы камітэт па супрацоўніцтве. Камісіі па напрамках супрацоўніцтва, якія ствараюцца пры гэтым камітэце, узначальваюцца кіраўнікамі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання.

4. Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь:

4.1. у 2015 годзе сфарміраваць доўгатэрміновую аснову супрацоўніцтва з Міжнародным аддзелам Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Кітая па пяці ключавых напрамках:

рэгулярны абмен візітамі высокага ўзроўню;

арганізацыя сістэмы ўзаемных стажыровак работнікаў Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і Міжнароднага аддзела Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Кітая;

узаемадзеянне ў рэалізацыі канцэпцыі будаўніцтва Эканамічнага пояса Шаўковага шляху;

супрацоўніцтва ў даследаванні прынцыпаў устойлівага развіцця грамадства;

умацаванне ўзаемадзеяння аналітычных цэнтраў і сродкаў масавай інфармацыі;

4.2. з улікам новых рэалій у палітычным і эканамічным партнёрстве распрацаваць і да 1 студзеня 2016 г. прыняць план двухбаковага супрацоўніцтва на пяцігадовы тэрмін паміж Адміністрацыяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і Міжнародным аддзелам Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Кітая.

5. Дзяржаўнаму сакратарыяту Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь у 2015 годзе:

забяспечыць планаванне, каардынацыю і паглыбленне супрацоўніцтва з КНР у ваеннай і ваенна-тэхнічнай сферах, а таксама ў сферы бяспекі і ліквідацыі наступстваў стыхійных бедстваў і надзвычайных сітуацый;

сумесна з кітайскімі сіламі вывучыць змест і напрамкі супрацоўніцтва, пералік сумесных праектаў на перыяд да 2020 года.

6. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь сумесна з зацікаўленымі дзяржаўнымі органамі, аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам:

6.1. да 1 студзеня 2016 г.:

вызначыць персанальную адказнасць кіраўнікоў рэспубліканскіх і мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання і іншых дзяржаўных арганізацый за развіццё супрацоўніцтва з КНР;

вызначыць механізмы ўзмацнення каардынацыйнай ролі Камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве Беларуска-Кітайскага міжурадавага камітэта па супрацоўніцтве;

прапрацаваць пытанне аб мэтазгоднасці стварэння ў міністэрствах замежных спраў і эканомікі самастойных структурных падраздзяленняў па развіцці супрацоўніцтва з КНР за кошт павелічэння штатнай колькасці гэтых міністэрстваў;

арганізаваць прамое ўзаемадзеянне з профільнымі структурамі КНР па падрыхтоўцы і ўзгадненні плана мерапрыемстваў па спрашчэнні працэдур і нарматыўных патрабаванняў, звязаных з мерамі тэхнічнага рэгулявання, санітарнага, фітасанітарнага, ветэрынарна-санітарнага і санітарна-эпідэміялагічнага кантролю (нагляду), з мэтамі забеспячэння паляпшэння ўмоў узаемнага доступу на рынкі. Укараніць ва ўзаемным гандлі электронны сертыфікат кантролю якасці і каранціну;

стварыць сумесную кампанію па арганізацыі, суправаджэнні і прасоўванні ўзаемных паставак тавараў і паслуг;

укараніць ва ўзаемным гандлі сістэму прапанавання і прасоўвання беларускіх тавараў на электронных гандлёвых пляцоўках КНР;

на ўзаемнай аснове правесці працу па зніжэнні ўзроўню тарыфных і нетарыфных бар'ераў ва ўзаемным гандлі з КНР;

сфарміраваць комплексны план дзеянняў па дасягненні да 2020 года ўзроўню экспартных паставак у КНР у суме не менш як 1,5 млрд долараў ЗША;

6.2. у інвестыцыйнай сферы:

развіваць супрацоўніцтва на аснове павелічэння ўзаемных інвестыцый і стварэння спрыяльнага інвестыцыйнага клімату;

да 1 ліпеня 2016 г. сфарміраваць пералік прадпрыемстваў для прыцягнення буйных кітайскіх кампаній у праекты па развіцці кааперацыі і ўваходжанні ў акцыянерны капітал у сферы сельскагаспадарчага і цяжкага машынабудавання, станкабудавання, вытворчасці бытавой тэхнікі і электронікі, оптыка-механічнай прамысловасці, вытворчасці вырабаў з палімераў, тавараў медыцынскага прызначэння і бытавой хіміі;

сфарміраваць механізмы стымулявання прыцягнення ў 2016—2020 гадах прамых кітайскіх інвестыцый у энергетыку, вытворчасць будаўнічых матэрыялаў, транспартную інфраструктуру, вытворчасць і перапрацоўку сельскагаспадарчай прадукцыі і іншыя галіны, якія ўяўляюць узаемны інтарэс;

арганізаваць на тэрыторыі КНР зборачныя вытворчасці беларускай сельскагаспадарчай тэхнікі і сістэму яе перадпродажнага і паслянродажнага абслугоўвання з улікам рэгіянальных асаблівасцей і вытворча-збытавых ланцужкоў буйных кітайскіх карпарацый. У 2016 годзе забяспечыць выпуск гэтымі вытворчасцямі і продаж не менш як 6 тыс. трактароў і 3 тыс. камбайнаў з нарошчваннем зборкі ў наступныя гады;

на сістэмнай аснове развіваць крэдытнае супрацоўніцтва на прынцыпах канкурснасці і сярэднетэрміновай акупнасці зыходзячы з прыярытэтнасці накіравання фінансавых сродкаў на развіццё малога і сярэдняга бізнесу і прыцягненне прамых кітайскіх інвестыцый праз крэдытныя інструменты;

актуалізаваць і ўзгадніць дзяржаўныя праграмы, прынятыя ў Рэспубліцы Беларусь, у сферы мадэрнізацыі і развіцця транспартнай, лагістычнай, інфармацыйна-камунікацыйнай, мытнай інфраструктуры з падыходамі па ўдзеле Рэспублікі Беларусь у канцэпцыі будаўніцтва Эканамічнага пояса Шаўковага шляху і Марскога шляху XXI стагоддзя. Сфарміраваць адзіную стратэгію на перыяд да 2030 года;

пашырыць супрацоўніцтва ў галіне грамадзянскай авіяцыі. Сфарміраваць на 2016 — 2020 гады падыходы да формаў і механізмаў гэтага супрацоўніцтва, павелічэння аб'ёмаў паветраных перавозак;

штогод фарміраваць графік удзелу рэспубліканскіх і мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання ў кітайскіх міжнародных інвестыцыйных кірмашах і форумах, забяспечыць высокі ўзровень прадстаўніцтва ўдзельнікаў гэтых мерапрыемстваў;

6.3. у фінансавай сферы:

забяспечыць штогадовы прырост выкарыстання нацыянальных валют ва ўзаемным гандлі, кітайскіх юаняў у дыверсіфікацыі структуры золатавалютных рэзерваў, а таксама ў размяшчэнні дзяржаўных і карпаратыўных каштоўных папер;

на рэгулярнай аснове актуалізаваць і ўкараняць новыя гібкія метады фінансавання інвестыцыйных праектаў;

выпрацаваць умовы і формы прыцягнення на рынак Рэспублікі Беларусь банкаўскіх паслуг кітайскіх банкаў і прыняць меры па іх прадастаўленні ў Рэспубліцы Беларусь;

з мэтамі арганізацыі венчурнага фінансавання інавацыйных праектаў, развіцця малога і сярэдняга бізнесу, павышэння эфектыўнасці дзяржаўных прадпрыемстваў прапрацаваць з кітайскім бокам пытанне стварэння сумеснага беларуска-кітайскага інвестыцыйнага фонду;

6.4. у галіне навукі і тэхнікі:

лічыць асноўным напрамкам супрацоўніцтва з КНР стымуляванне сумеснага развіцця галіновай навукі;

стварыць умовы для камерцыялізацыі вынікаў навукова-тэхнічнай дзейнасці і стварэння сумесных інавацыйных вытворчасцей на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і КНР;

забяспечыць практычную рэалізацыю мерапрыемстваў, якія прадугледжаны сумеснымі праграмамі навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь і КНР, зацверджанымі на 2015 — 2016 гады, і да 1 ліпеня 2016 г. сфарміраваць пералік новых інавацыйных праектаў на 2017 — 2020 гады;

да 1 ліпеня 2016 г. сфарміраваць пералік новых сумесных даследчых і навукова-практычных цэнтраў з удзелам арганізацый Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, устаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь і кітайскіх партнёраў па канкурэнтных перспектыўных напрамках;

да 1 студзеня 2017 г. гарманізаваць механізмы прававой абароны і патэнтавання аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці дзвюх краін;

6.5. у галіне супрацоўніцтва па развіцці Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка «Індустрыяльны парк «Вялікі камень» (далей — Парк):

суправаджаць праект стварэння Парка як стратэгічны праект у інвестыцыйнай сферы, узор маштабнага супрацоўніцтва паміж Рэспублікай Беларусь і КНР, а таксама найважнейшы элемент удзелу Рэспублікі Беларусь у канцэпцыі будаўніцтва Эканамічнага пояса Шаўковага шляху;

забяспечыць захаванне найлепшага прававога рэжыму для рэзідэнтаў Парка ў параўнанні з іншымі льготнымі рэжымамі вядзення камерцыйнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь і ў краінах ЕАЭС;

у выпадках няяснасці і недакладнасці прадпісанняў нарматыўных прававых актаў забяспечыць прыняцце дзяржаўнымі органамі рашэнняў на карысць дзяржаўнай установы «Адміністрацыя Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка «Індустрыяльны парк «Вялікі камень», Кітайска-Беларускага сумеснага закрытага акцыянернага таварыства «Кампанія па развіцці індустрыяльнага парка» і рэзідэнтаў Парка;

стварыць на тэрыторыі Парка рэгіянальны лагістычны цэнтр з прымяненнем перадавога вопыту КНР у будаўніцтве аб'ектаў-аналагаў і комплексным абслугоўванні рэзідэнтаў у адпаведнасці з найлепшай сусветнай практыкай;

6.6. у галіне рэгіянальнага супрацоўніцтва:

сфарміраваць і зацвердзіць праграму міжрэгіянальных выставачна-кірмашовых мерапрыемстваў, Дзён правінцый і абласцей, гарадоў на перыяд да 2020 года са штогадовай яе актуалізацыяй і канкрэтызацыяй;

фарміраваць штогадовы план візітаў кіраўнікоў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў з перыядычнасцю не менш як адзін раз на год у кожную правінцыю (аўтаномную акругу, горад), з якой падпісаны пагадненні аб супрацоўніцтве і пабрацімскіх сувязях;

да 1 студзеня 2020 г. забяспечыць ахоп большасці правінцый і гарадоў цэнтральнага падпарадкавання КНР пагадненнямі аб супрацоўніцтве з абласцямі і гарадамі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці са структурай вытворчасці і перспектывамі эканамічнага развіцця;

распрацаваць і зацвердзіць на ўзаемнай аснове праграмы супрацоўніцтва абласцей і гарадоў Рэспублікі Беларусь з правінцыямі, аўтаномнымі акругамі і гарадамі КНР на перыяд да 2020 года, прадугледзеўшы ў іх рэалізацыю канкрэтных інвестыцыйных праектаў, стварэнне сумесных вытворчасцей, узаемную пастаўку тавараў;

штогод на перыяд да 2020 года забяспечваць кожнай вобласцю і г. Мінскам прыцягненне ў рамках міжрэгіянальнага супрацоўніцтва не менш як 100 млн долараў ЗША прамых кітайскіх інвестыцый;

6.7. у гуманітарнай сферы:

узгадніць з кітайскімі партнёрамі і зацвердзіць праграму накіравання на навучанне беларускіх юнакоў і дзяўчат ва ўстановы вышэйшай адукацыі КНР пачынаючы з 2016/17 вучэбнага года. Распрацаваць парадак і ўмовы бюджэтнай падтрымкі такога навучання;

да 1 студзеня 2016 г. сумесна з кітайскімі партнёрамі распрацаваць праграму стварэння да 2018 года цэнтраў традыцыйнай кітайскай медыцыны і цэнтраў традыцыйнай кітайскай гімнастыкі ў кожным абласным цэнтры Рэспублікі Беларусь;

арганізаваць стварэнне сумеснай турыстычнай кампаніі, якая спецыялізуецца на ўзаемным фарміраванні тураў і экскурсій, падрыхтоўку гідаў-перакладчыкаў;

вызначыць форму і механізм узаемадзеяння паміж рэспубліканскім унітарным прадпрыемствам «Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм» і кітайскай кампаніяй «China Film Group Corporation» (CFGC);

сфарміраваць сістэму, перыядычнасць, напрамкі культурнага абмену паміж дзвюма краінамі на перыяд да 2020 года;

прыняць меры да вядзення афіцыйнага сайта Рэспублікі Беларусь у тым ліку на кітайскай мове.

7. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь сумесна з Нацыянальным банкам, аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам, Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнаму сакратарыяту Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь прыняць неабходныя меры па выкананні гэтай Дырэктывы.

8. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнаму сакратарыяту Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь два разы на год (да 15 студзеня і да 15 ліпеня) у вызначаным парадку дакладваць кіраўніку дзяржавы аб ходзе выканання гэтай Дырэктывы.

9. Кантроль за выкананнем гэтай Дырэктывы ўскласці на Адміністрацыю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь
Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

У РЫТМЕ ВЯЛІКАЙ РАБОТЫ

З любой задачай можна справіцца, калі думаць пра будучыню, не шкадаваць укладанняў і ставіцца з любоўю і па-гаспадарску

Мінскую вобласць нярэдка параўноўваюць з сэрцам краіны. І недарэмна: знаходзячыся ў самым цэнтры Беларусі, яна і сапраўды сваімі абрысамі нагадвае сэрца. Але галоўнае — Міншчына задае імпульс іншым рэгіёнам у многіх сферах гаспадарання і кірунках развіцця, лідзіруе па многіх паказчыках (узяць хаця б сёлетні, больш чым двухмільённы, намалот збожжавых і рэкордную ўраджайнасць). Сэрца краіны б'ецца ў нармальным рабочым рытме — значыць, і ўвесь «арганізм» адчувае сябе добра...

Пра тое, як удаецца захаваць гэты нармальны рабочы рытм у няпростых эканамічных рэаліях, пра спецыфіку і прыярытэты прысталічнага рэгіёна, пра чалавечы патэнцыял і перспектывы, якія можна і трэба бачыць у любых умовах, разважае старшыня Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Сямён ШАПІРА.

Фота БЕЛТА.

Міншчына — традыцыйны лідар па ўраджаю збожжавых. І хлебаробам тут — асаблівая пашана.

— Сямён Барысавіч, вы працуеце кіраўніком Мінскай вобласці ўжо амаль два гады. Якія для самога сябе як для губернатара вы вызначылі прыярытэты развіцця Міншчыны? Ці адрозніваюцца яны ў цэнтральнага рэгіёна?

— Прыярытэты ў вобласці сёння такія ж, як і ва ўсёй краіны: захаваць вытворчасць, працоўныя месцы, узровень жыцця людзей, забяспечыць выкананне сацыяльных стандартаў. Праектам прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця на гэты год для вобласці рост валавога рэгіянальнага прадукту вызначаны на ўзроўні 100,9-101,3%. Такі паказчык адпавядае і запланаванаму на рэспубліканскім узроўні. А як вядома, менавіта гэтыя лічбы ва ўсім свеце з'яўляюцца крытэрыем ацэнкі якасці работы і ўзроўню жыцця насельніцтва. Складнікі валавога ўнутранага прадукту — прыбытак і аплата працы — сёння самыя дакладныя паказчыкі эфектыўнасці.

У нашай вобласці найбольшую ўдзельную вагу — амаль палову — у валавым рэгіянальным прадукце займае вытворчасць прамысловай прадукцыі. Таму можна сказаць, што буйны прамысловы сектар з'яўляецца платформай, стрыжнем эканомікі — гэта сапраўды так. Аднак рухавік устойлівага эканамічнага росту — гэта прыватны сектар, а менавіта — малы і сярэдні бізнес. У вобласці з кожным годам расце прадпрымальніцкая актыўнасць, паступова мяняецца структура эканомікі, у якой вядучая роля пераходзіць да недзяржаўнага сектара. Удзельная вага паступленняў ад суб'ектаў гаспадарання малога і сярэдняга бізнесу ў агульным аб'ёме складае амаль 35%. Наша задача да 2016 года — павялічыць гэты паказчык да 50%.

Сярод прыярытэтаў сёння — не толькі нарошчванне экспарту, але і змяненне яго структуры за кошт скарачэння долі сыравінных прадуктаў і павелічэння паставак навукаёмістай, інавацыйнай прадукцыі, тэхнічна складаных вырабаў, новых мадэляў лёгкай прамысловасці, прадуктаў харчавання і іншай прадукцыі з высокай дабаўленай вартасцю. У пашырэнні геаграфіі экспарту вялікае значэнне маюць кантакты на рэгіянальным узроўні, мы над гэтым сёння актыўна працуем, сведчаннем таму — наладжаныя сувязі Міншчыны з многімі рэгіёнамі Расіі, а ў апошні час — і з правінцыямі Кітая.

Яшчэ адзін з найважнейшых напрамкаў работы — прыцягненне інвестыцый, якія дазволяць стварыць новыя рабочыя месцы і рэалізаваць новыя праекты імпартазамяшчальнай і экспартнаарыентаванай накіраванасці. Пры гэтым не менш важная задача — павышаць эканамічную эфектыўнасць выкарыстання інвестыцый, укладваючы іх у актыўную частку асноўных сродкаў — набываючы машыны, абсталяванне, транспарт...

Несумненна, захаваць эканоміку на плаву — задача найпершай важнасці, і гэта неадноўчы падкрэслівалася на самым высокім дзяржаўным узроўні. Але клопат аб людзях, сацыяльная абарона — у нашай краіне прыярытэт непарушны. Новае ў такім кірунку — прыцягненне недзяржаўных некамерцыйных арганізацый да аказання сацыяльных паслуг і рэалізацыі сацыяльных праектаў у межах дзяржаўнага сацыяльнага заказу.

Дзеці і жанчыны, якія выхоўваюць дзяцей, у нашай дзяржаве — прадмет асаблівай увагі і клопату. У Пасланні да беларускага народа і Нацыянальнага сходу Прэзідэнт звярнуў увагу на праблему старэння насельніцтва і на тое, што трэба зрабіць усё для таго, каб пажылыя людзі ў нашай краіне дажывалі свой век дагледжанымі і шчаслівымі. На Міншчыне вядзецца актыўная работа па вырашэнні гэтай праблемы. Сёлета і налета плануецца адкрыць 13 аддзяленняў кругласутачнага знаходжання адзінокіх старых і 11 дамоў сумеснага самастойнага пражывання.

— У сённяшніх няпростых эканамічных умовах вельмі важны і чалавечы фактар, і выканальніцкая дысцыпліна, і кантроль. І, вядома, наяўнасць прафесійных кадраў на месцах. На Міншчыне, прынамсі з апошнім, павінна быць прасцей, чым у іншых...

— Вы лічыце, што прасцей? Не пагаджуся, бо праблема забеспячэння высокакваліфікаванымі кадрамі ў розных галінах, асабліва ў аграпрамысловым комплексе, існуе ва ўсіх рэгіёнах краіны, і Міншчына тут не выключэнне. Да таго ж у нас блізка сталіца, і таму адсюль часцей, чым з іншых рэгіёнаў, запрашаюць у Мінск спецыялістаў, якія добра сябе зарэкамендавалі...

Дарэчы, работа з кадрамі — яшчэ адзін з асноўных прыярытэтаў, прычым на ўсіх узроўнях, ва ўсіх установах і на прадпрыемствах.

Аналіз вынікаў працы паказаў, што ёсць станоўчая дынаміка колькасных і, галоўнае, якасных паказчыкаў мерапрыемстваў па рэалізацыі кадравай палітыкі на Міншчыне. На гэта ў пэўнай ступені аказала ўплыў мэтанакіраваная работа па рэарганізацыі некаторых прадпрыемстваў і аптымізацыя колькасці кіраўнічага апарату ў бюджэтных арганізацыях. Але, безумоўна, яшчэ застаюцца праблемы з замяняльнасцю кадраў, дэфіцытам кіраўнікоў і спецыялістаў у сельскай гаспадарцы, медыцынскіх работнікаў...

У вобласці нядрэнна пастаўлена работа па павышэнні кваліфікацыі і перападрыхтоўцы кадраў, эфектыўна працуем з кадравым рэзервам — летась эфектыўнасць яго выкарыстання склала амаль 60 працэнтаў. Прывяду некалькі прыкладаў. У мінулым годзе пяць маладых спецыялістаў ва ўзросце 33-40 гадоў узначалілі райвыканкамы: Віктар Каляда — Лагойскі, Юрый Горлаў — Стаўбцоўскі, Андрэй Зубар — Чэрвеньскі, Андрэй Янчэўскі — Слуцкі, Віктар Кот — Вілейскі. З задавальненнем магу канстатаваць, што мы не памыліліся з выбарам. Справы ў гэтых раёнах значна палепшыліся, і нават на нарадах я нярэдка стаўлю іх у прыклад іншым кіраўнікам — са значна большым стажам работы і жыццёвым вопытам.

З ліку найбольш кваліфікаваных спецыялістаў-рэзервістаў дзесяць чалавек нядаўна прызначаны на пасады кіраўнікоў сельскагаспадарчых арганізацый. Напрыклад, Арцём Кочатаў стаў дырэктарам прадпрыемства «Лагавішча-Агра» Дзяржынскага раёна, Сяргей Карнееў — кіраўніком Крупскага райаграсервіса, Аляксей Родзік узначаліў саўгас «Слуцк»... Акрамя таго, вельмі добра праявілі сябе і іншыя маладыя кіраўнікі абласных арганізацый, сярод якіх Мікалай Карповіч і Мікалай Астрэйка.

Лозунг пра тое, што кадры вырашаюць усё, вядомы яшчэ з савецкіх часоў. Але я ўпэўнены, што з цягам часу яго актуальнасць ніколькі не зменшылася. Да гэтага варта дадаць словы стваральніка сусветна вядомай кампаніі Apple Стыва Джобса аб тым, што існуе толькі адзін спосаб зрабіць вялікую работу добра — палюбіць яе. Калі гэта будуць памятаць і разумець спецыялісты і кіраўнікі ўсіх узроўняў, узростаў і кваліфікацыі — любыя задачы выканаць здолеем.

— Падчас прыёмаў грамадзян, якія вы часта праводзіце ў розных рэгіёнах вобласці, самыя частыя пытанні, што ўздымаюцца, — жыллёвыя і зямельныя. Вядома, нерухомасць і зямля недалёка ад сталіцы — укладанні надзейныя. Можа, таму менавіта на Міншчыне найбольш фіксуецца парушэнняў зямельнага заканадаўства?

— Тут дарэчы будзе прывесці некаторыя лічбы. За першае паўгоддзе гэтага года землеўпарадкавальнымі службамі на тэрыторыі вобласці выяўлена 424 парушэнні на плошчы больш чым паўтары тысячы гектараў. Вы маеце рацыю наконт імкнення жыхароў валодаць зямлёй недалёка ад сталіцы. Ад агульнай колькасці парушэнняў 25% складаюць самавольныя заняцці зямлі. Прычым грашаць гэтым не толькі грамадзяне, але і прадпрымальнікі, і прадпрыемствы і арганізацыі. Але вось, калі ласка, адваротны бок медаля — самае папулярнае ў спісе парушэнняў (амаль 60% ад агульнага) — невыкарыстанне зямельнага ўчастка, прасцей кажучы, занядбанне зямлі. Чалавек бярэ зямлю, але яе не выкарыстоўвае на працягу гадоў, мала таго — нават нярэдка не даглядае ўчастак, які зарастае быллём і хмызняком. Навошта тады было браць? Занадта вялікая раскоша, не кажучы ўжо пра элементарны парадак у ваколіцах сталіцы. Такія ўчасткі мы адбіраем і перараз мяркоўваем у адпаведнасці з заканадаўствам.

— Увогуле, блізкасць да самага цэнтра краіны, мне здаецца, накладвае адбітак і на псіхалогію людзей, і на ўмовы, у якіх яны жывуць і працуюць. Напрыклад, пытанне занятасці ў блізкіх ад Мінска раёнах не стаіць так востра: сталіца патрабуе шмат рабочай сілы. Але моладзь едзе з вёсак, мястэчак, райцэнтраў, у якіх таксама павінен нехта працаваць. Дый самыя лепшыя кадры, як вы адзначылі, сталіца да сябе запрашае. Пытанне складанае? Ці ўсё ж вырашальнае?

— Знешне ўсё нібыта так і выглядае. Праўда, статыстыка сведчыць пра іншае. Безумоўна, прысталічная вобласць служыць кузняй кадраў для Мінска. Але за мінулы год у сталіцу з населеных пунктаў вобласці выехала пятнаццаць з паловай тысяч чалавек, а з Мінска ў вобласць прыбылі больш за сямнаццаць з паловай тысяч. Колькасць вакансій у параўнанні з мінулым годам скарацілася амаль удвая. Несумненна, паўплывалі на гэта і эканамічная сітуацыя, і дэкрэт Прэзідэнта аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства...

Многія прыязджаюць у вобласць з той жа сталіцы, каб адкрыць сваю справу. На пачатак гэтага года на Міншчыне ажыццяўляў сваю дзейнасць 57 851 суб'ект малога і сярэдняга прадпрымальніцтва. Магчымасцяў у таго, хто хоча і можа працаваць у гэтай сферы побач са сталіцай, — больш чым дастаткова. Да таго ж, калі дзейнасць накіравана на вытворчасць імпартазамяшчальнай і экспартаарыентаванай прадукцыі, ёсць магчымасць атрымаць падтрымку ў рамках Праграмы дзяржаўнай падтрымкі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва Мінскай вобласці. Летась, напрыклад, такая падтрымка была аказана 10 суб'ектам бізнесу на суму 12,7 млрд рублёў — на закупку абсталявання, сыравіны, стварэнне рабочых месцаў.

Прывяду адзін прыклад. Прадпрыемству СТАА «СатБор» (Барысаўскі раён) у рамках вышэйназванай праграмы ў мінулым годзе быў выдадзены льготны крэдыт у памеры 4,4 млрд рублёў для набыцця сучаснага дрэваапрацоўчага абсталявання. Эфектыўнасць работы прадпрыемства відавочная: у параўнанні з 2013 годам рэнтабельнасць выросла амаль на 5% і склала 25,2%, аб'ём чыстага прыбытку вырас у 1,6 раза. Пастаўкі прадукцыі на экспарт выраслі ў тры разы. Такіх прыкладаў можна прыводзіць нямала.

— Асобная размова — пра гарады-спадарожнікі, у якія фактычна тыя, хто працуе ў сталіцы, прыязджаюць толькі начаваць.

— Перш за ўсё, не трэба забывацца пра тое, што стварэнне гарадоў-спадарожнікаў мае мэтай вынас прамысловых прадпрыемстваў Мінска, на якіх і сёння працуюць жыхары гэтых гарадоў. З цягам нядоўгага часу людзі будуць забяспечаны работай па месцы жыхарства, да таго ж з'явяцца рабочыя месцы для незанятага насельніцтва гэтых гарадоў. Можна гаварыць, што кожны горад-спадарожнік будзе спецыялізавацца ў якой-небудзь сферы дзейнасці. Напрыклад, Смалявічы будуць развівацца разам з Кітайска-беларускім індустрыяльным паркам. У Рудзенску добрыя ўмовы для работы прамысловасці, бо ёсць ЦЭЦ, запасы вады, чыгунка, а вакол горада нямала незанятых зямель нясельскагаспадарчага прызначэння. Горад Фаніпаль стане прамысловым горадам-спадарожнікам.

Перанос буйных прадпрыемстваў — справа не аднаго дня, а вось новыя рабочыя месцы ў гарадах-спадарожніках ствараюцца ўжо сёння. За апошнія два гады ў Заслаўі, Смалявічах, Фаніпалі, Дзяржынску, Лагойску, Рудзенску іх было створана больш як дзве тысячы. Так, прыватнае прадпрыемства «Енісей» летась завяршыла ў Заслаўі будаўніцтва завода па апрацоўцы шкла з высокатэхналагічным сучасным абсталяваннем. Колькасць занятых на новым прадпрыемстве — больш за 60 чалавек. У тым жа Заслаўі на прадпрыемстве «Марк Фармель» створана 100 новых працоўных месцаў, на мэблевай фабрыцы — 60, а ўсяго за гэты час у горадзе, з улікам індывідуальных прадпрымальнікаў, — 672 рабочыя месцы.

— На тэрыторыі вобласці будуецца найважнейшы для эканомікі краіны аб'ект — Кітайска-беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень». Дывідэнды, якія з гэтага атрымае Міншчына, ужо спрабавалі падлічыць?

— Дывідэнды атрымае не толькі Міншчына, але і ўся краіна. Гэты праект дазволіць не толькі актывізаваць гандлёва-эканамічнае і інвестыцыйнае супрацоўніцтва з Кітаем, але і прыцягнуць замежныя і айчынныя інвестыцыі для арганізацыі і развіцця высокатэхналагічных канкурэнтаздольных вытворчасцяў. Развіццё ў індустрыяльным парку вытворчасцяў электронікі, машынабудавання, тонкай хіміі і новых матэрыялаў дазволіць вырабляць высокатэхналагічныя тавары і мінімізаваць імпарт. Гэта мільёны долараў інвестыцый, сотні новых працоўных месцаў, развіццё інфраструктуры рэгіёна — пагадзіцеся, нямала.

Што тычыцца дывідэндаў у самым літаральным іх разуменні... Прыбытак атрымлівае той, хто ўкладвае. Мінскім аблвыканкамам ва ўстаўны фонд Кітайска-Беларускага СЗАТ «Кампанія па развіцці індустрыяльнага парка» ўжо ўнесена амаль 345 мільярдаў рублёў, набыта 27 мільёнаў акцый. Так што мы не проста назіральнікі — мы непасрэдныя ўдзельнікі стваральнага працэсу.

— Асаблівая зона Міншчыны — Нарачанскі край. Як, на думку губернатара, сумясціць выкарыстанне напоўніцу яго турыстычнага патэнцыялу і захаванне ўнікальнай прыроды, якая асновай гэтага патэнцыялу і з'яўляецца?

— Сёлета завяршаецца дзеянне Дзяржаўнай праграмы развіцця курортнай зоны Нарачанскага рэгіёна. Увесь гэты час вялася мэтанакіраваная работа па стварэнні буйнога аздараўляльнага, культурна-забаўляльнага і турыстычнага цэнтра, які будзе не толькі прыцягваць інвестыцыі, але і працаваць на захаванне ўнікальнага прыроднага комплексу. Сёння можна ўжо гаварыць пра тое, што гэта задача практычна выканана. Нарачанскі край сапраўды стаў прыцягальным для шматлікіх турыстаў, у тым ліку з блізкага і далёкага замежжа, не толькі з-за сваёй прыроды, але і з-за развітай сучаснай інфраструктуры. Адрамантаваны санаторыі, базы адпачынку, дарогі, наладжаны шматлікія туры, у тым ліку экалагічныя. 12 з паловай тысяч чалавек занятыя ў эканоміцы Нарачанскага краю. Экспарт паслуг летась склаў больш за 19 млн долараў. Гэты ўнікальны рэгіён Міншчыны і ўсёй краіны дынамічна развіваецца, і гэта добра, — найперш для людзей, якія там жывуць.

Як захаваць унікальную экасістэму? Можна разважаць пра беражлівае стаўленне да прыроды, пра экалагічнае выхаванне, пра кантроль і прафілактычныя мерапрыемствы. Усё гэта, безумоўна, важна. Але, думаю, не памылюся, калі скажу, што не менш важна ўкладваць у гэту справу не толькі душу, але і немалыя сродкі. Ахова прыроды, яе аднаўленне — паняцці ў сучасным свеце нятанныя.

За час рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы развіцця курортнай зоны Нарачанскага рэгіёна на 2011—2015 гады асвоена 628 млрд рублёў, з іх 88 млрд — інвестарамі, якія рэалізавалі свае інвестыцыйныя праекты на рэкрэацыйнай тэрыторыі. Назаву найбольш важкія: этнакультурны турыстычны агракомплекс «Наносы-Навасёлле», база вясковага адпачынку і рыбалоўства ў фермерскай гаспадарцы «Лясная сядзіба», аптэкарскі сад, будаўніцтва ветраэнергетычнай установкі «Нордэкс» магутнасцю 1МВт.

Думаць пра будучыню, не шкадаваць інвестыцый, ставіцца з любоўю і па-гаспадарску. Ці не гэта і ёсць формула поспеху? У дачыненні да любой справы...

Пытанні задавала
Алена ЛЯЎКОВІЧ. *alena@zviazda.by*

Сямейная газета

Выпуск № 14 (37)

НАМ УСІМ ПАТРЭБНА ГЕРАНЬ

«Іду раніцай дадому. На пад'ездзе аб'ява: «Дарагія суседзі! Сёння прыкладна ў 9.20 каля прахадных дзвярэй было згублена 120 тыс. руб. Калі хтосьці знайшоў, занясіце, калі ласка, у кв. 76 Антаніне Пятроўне. Пенсія 1 млн 970 тыс.». Я адкладаю патрэбную суму, падымаюся, званю ў дзверы. Адкрывае бабуля ў фартуху. Толькі ўбачыла мяне з грашыма ў руках, адразу абдымацца, галасіць — і ў слёзы шчасця. І распавяла: «Пайшла па муку, вярнуўшыся, вымала ключы ля пад'езда — грошы, напэўна, і вылецелі з кішэні». Але 120 тысяч браць адмовілася наадрэз! Аказалася, за пару гадзін я ўжо шосты (!!!) «знайшоў» бабуліны грошы!» Калі я пачула гэтую гісторыю, на душы стала вельмі цёпла і радасна. Не толькі за бабулю, але і за тых людзей, што вярталі ёй СВАЕ грошы. І ўзгадаліся радкі Уладзіміра Караткевіча:

«Што такое багацця гной,
Улада ўся, золата свету
Перад простай
людской цеплынёй?»

Апошнім часам у розных месцах горада сустракаю адных і тых жа нармальна адзетых маладых людзей. Яны просяць у мінакоў (як правіла жанчын) грошы: то на цягнік, то на ежу. Першы раз я паверыла і дапамагла: рознае ў жыцці здараецца, мо і сапраўды абрабавалі, і няма за што вярнуцца дадому. Але калі сустрэла іх чарговы раз з падобнай просьбай, закралася падазрэнне, што мне хлусяць. Таму замест грошай на ежу працягнула яблык... Напэўна, такога павароту падзей яны не чакалі. Не паспела і вокам міргнуць, хлопцаў як ветрам здзьмула. Праўда, замест падзякі паспела пачуць у свой адрас абразлівыя словы. «Вось і дапамагай пасля гэтага людзям...» — абураецца бурклівая частка майго ўнутранага «Я». «Дапамагай і пасля гэтага людзям!» — не пагаджаюся з ёй.

У такія моманты ўзгадваю бабуль і дзядуляў (яны ёсць, напэўна, у кожным горадзе), якім сорамна прасіць. Таму яны прадаюць старыя кнігі, значкі або герань... Па-мойму, нам усім вельмі-вельмі патрэбна герань! Бо яшчэ Фёдар Міхайлавіч Дастаеўскі пісаў, што прыгажосць выратуе свет. І меў на ўвазе, вядома, не вонкавую, а душэўную. А таго, хто не верыць у цуды, на якія здольная дабрыня, чуласць і спагадлівасць, запрашаю да сябе ў госці і расказваю пра Пашу. Хлопца, што выцягнуў з вады маленькі руды камячок, які бессардэчныя людзі спрабавалі ўтапіць у Свіслачы. Тым самым падарыў цуд не толькі Цуду (такую мянушку я дала кацяняці пазней), але і мне. Так што, як бачыце, цуды здараюцца . А чараўнік жыве ў кожным з нас...

Надзея ДРЫЛА.

dryla@zviazda.by

■ Тычыцца кожнага

«ХЭПІ-ЭНД» З СУМНЫМ АСАДКАМ

Ганна Бахур з маленькім сынам нарэшце вярнуліся дадому

У пятніцу раніцай мне патэлефанавала шчаслівая маці: «Нам пакідаюць сына! Сказалі, што неўзабаве зможам вярнуцца дадому!». А днём раней у сваёй бальнічнай палаце яна чакала прыняцця рашэння. Сумна жартавала тады: чакаю, як арыштант прысуду. І магло так стацца, што прысуд той стаў бы пакараннем. Калі б у яе забралі дзіця, выходзіць, пакаралі б за тое, што сама нарадзілася не такой як усе, за тое, што стала маці...

Фота БЕЛТА.

У 37-гадовай Ганны Бахур прыроджаная анамалія канечнасцяў. Яна інвалід першай групы. Калі сказаць проста, нарадзілася без кісцяў рук, з кароткімі нагамі, крыху недаразвітымі ступнямі. Але з гэтым сваім калецтвам Аня даўно навучылася жыць. Жанчына ўсё робіць па хатняй гаспадарцы, даглядае агарод, шые. Больш за тое, яна піша карціны, найбольш пейзажы. У яе ёсць сябры, якія іх часам прадаюць. Значыць, можа зарабіць дадатковую капейку да сваёй пенсіі ў сям'ю.

Разам са сваім мужам Анатолем, таксама інвалідам першай групы, зрабілі цудоўны рамонт у двухпакаёвай кватэры, усё падрыхтавалі для свайго чаканага сыночка. Аня пакрыўдзілася на адно з выданняў, якое напісала, што кватэру ім выдзеліла дзяржава. Я патлумачыла ёй, што калегі, хутчэй за ўсё, не хацелі перайначыць факты. Гэта выйшла, відаць, па інерцыі.

Бо такая практыка распаўсюджана, інвалідаў у нас нярэдка забяспечваюць бясплатным жыллём. Кватэра Бахураў у Івацэвічах — свая, фармальна яна належыць бацьку Анатоля.

Маладая маці ўсяляк старалася падкрэсліць: у іх усё ёсць, яны нічога не просяць, хочуць толькі аднаго, каб іх пакінулі ў спакоі. Але неўзабаве пасля нараджэння сына Ганне аб'явілі, што яна па прычыне інваліднасці дзіця выхоўваць не можа, як і гаворыцца ў пастанове Міністэрства аховы здароўя. Таму трэба рыхтавацца да перадачы яго ў прытулак альбо ў прыёмную сям'ю. Пазней узнікла гаворка пра апеку над маленькім Косцікам. Узнікла пасля таго, як гісторыя сям'і Бахур стала вядомая ўсёй краіне, і Ганну ў Івацэвіцкай бальніцы наведала міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна Шчоткіна. Міністр тады назвала сітуацыю нестандартнай, паабяцала дапамогу.

У бальнічнай палаце мы гаварылі з Аняй аб усім. Гадзіну-другую ...я назірала, як яна спрытна ўпраўляецца з малым: корміць, адзявае, закалыхвае на руках. Як і ўсялякая маладая маці, яна з задавальненнем расказвае мілыя падрабязнасці, напрыклад пра тое, што ён спакойны, дае паспаць ноччу: «Часам сама прачнуся і думаю, няўжо ён спіць, пара ж карміць?» Вельмі радуецца, што ў яе дастаткова малака (пасля аперацыі, з дапамогай якой сын з'явіўся на свет, гэта не заўсёды бывае). А Косцік, паеўшы, надзімае шчокі, цярэбіць ножкамі і забаўна пакрэхтвае. Ён нарадзіўся даволі вялікім — крыху больш за чатыры кілаграмы — і абсалютна здаровым.

(Заканчэнне на 6-й стар. «СГ».)

■ Выпрабавана на сабе

ЖЫВЫ ХЛЕБ

Як я вучылася яго пячы, і што з гэтага атрымалася

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

Вераніка Шунейка частуе самапечаным хлебам.

На днях да нас у рэдакцыю завітала Вераніка Шунейка. Ды не з пустымі рукамі, а з бераžліва загорнутым у пергамент і льняную сурвэтку хлебам. Самае цікавае, што той бохан мы напярэдадні спяклі разам у Веранікі дома. Дакладней, пякла яна, а я назірала і матала на вус.

КРОК ПЕРШЫ: закваска

Шчыравалі мы на кухні два вечары запар. Спачатку Вераніка расказала мне, як рабіць закваску. З якой, у прыватнасці, і нараджаецца хлеб.

Гатуецца яна вельмі проста. Спатрэбіцца ўсяго толькі тры сталовыя лыжкі жытняй мукі і столькі ж вады пакаёвай тэмпературы. Усё гэта змяшчаем у шкляны слоік і добра вымешваем. Тут галоўнае зразумець, акцэнтуе маю ўвагу Вераніка, што **закваска павінна быць па кансістэнцыі, як густая смятана.** Слоік накрываем марляй (каб аснова для хлеба дыхала), якую замацоўваем матузком, захінаем у махровы ручнік і ставім у цёплае, цёмнае месца.

— Варта загадзя паклапаціцца, каб у кватэры не было скразнякоў, — кажа Вераніка. — І дачакацца, каб закваска добра паднялася і стварыла зверху шапку з бурбалак. Для гэтага яна павінна пастаяць у цяпле 2-3 дні. Праз кожныя 10 гадзін яе варта памешваць і падкормліваць усё той жа мукой і вадой. Выпякаю сапраўдны бездражжавы хлеб на натуральнай заквасцы ў хатніх умовах ужо амаль 3 гады. Праўда, пакуль прыйшла да добрага рэцэпту, напякла шмат розных бясформенных хлебчыкаў — хоць і смачных *(усміхаецца)*... А пачалося ўсё з таго, што заўважыла: як паем дражджавога хлеба з крамы — адчуваю цяжар у страўніку і вельмі хочацца салодкага. Калі ж перайшла на самапечаны, самаадчуванне палепшылася. Жытні хлеб з цэльназерневай мукі не толькі смачны, але і карысны для здароўя — ён дае жыццёвую энергію, сілы. Пяку яго 2 разы на тыдзень. Наогул лепш рабіць гэта рэгулярна. Тады і закваска не псуецца, заўсёды актуальная.

Дарэчы, мы з Веранікай пазнаёміліся на фестывалі пад Ракавам. Яна там праводзіла майстар-клас па выпечцы хлеба, як той казаў, па бабуліных рэцэптах. У той дзень мы і дамовіліся на некалькі індывідуальных урокаў. Як высветлілася, я такая не адна. Вераніка мае пяць вучняў, двое з іх пякуць хлеб пастаянна ўжо больш за год, у тым ліку і 80-гадовая жанчына.

КРОК ДРУГІ: рошчына

Рошчына ставіцца за 10 гадзін да таго моманту, калі вы задумалі пячы хлеб.

Бяром міску і адкладаем туды частку закваскі (для аднаго невялікага бохана дастаткова прыблізна паўшклянкі (100 мл); калі хочаце, каб хлеб атрымаўся больш кіслым, смела кладзіце больш). Дабаўляем 1 чайную лыжку солі, 3 чайныя лыжкі цукру, жытнюю муку і ваду **(рошчына павінна быць крыху больш вадкая, чым закваска)** і, вядома, любімыя спецыі. Мы дадалі каляндру, насенне льну, кропу і кмену.

(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)

■ Нататкі таткі

ДЗЯЦІНСТВА, ЯКОГА ПАЖАДАЎ БЫ Я...

У мінулыя выхадныя адбылося тое, чаго мне так не хапала ўжо цэлы год: нарэшце я выбраўся на сваю малую радзіму. У запасе ў мяне было толькі тры дні, але іх хапіла, каб пабыць у бацькоў, сустрэцца з братамі і сёстрамі. Падчас размоў мы спачатку хуценька абмяркоўвалі апошнія навіны і надзённыя праблемы, а потым да позняй ночы ўзгадвалі сваё дзяцінства. Смяяліся да слёз, перабівалі адзін аднаго бясконцым «а памятаеш?». Ужо на зваротнай дарозе, калі под музыку чыгункі я перабіраў самыя яркія моманты паездкі, упершыню задаўся пытаннем: «А якога дзяцінства я пажадаў бы сваёй дачцэ?».

Прызнаюся шчыра, ніколі раней пра гэта нават не думаў. Як тата, я стаўлю перад сабой галоўнай мэтай забяспечыць малую ўсім неабходным, даць ей максімум увагі. Часам я ўяўляю сабе яе далёкую будучыню, але не засяроджваю ўвагу на тым, якімі павінны быць гады самай бесклапотнай пары яе жыцця.

Мне ў гэтым плане пашанцавала: я вырас у шматдзетнай сям'і. Акрамя мяне, бацькі паставілі на ногі яшчэ трох братоў і шэсць сясцёр. Не буду крывіць душою: мы як ніхто іншыя ведалі, што такое нястача. Сямейнага бюджэту хапала толькі на самае неабходнае. Тым не менш мы ніколі моцна не засмучаліся з-за таго, што мелі больш сціплую, чым у аднагодкаў, вопратку... Не засмучаліся, бо ведалі не толькі цяжкасці і нястачу. Наша дзяцінства было напоўнена радасцю, любоўю, надзейнымі сябрамі, яркімі падзеямі — усё гэта заўсёды мела для нас прыярытэтны характар. Астатняе было вырашальна.

Так, штолета, каб дапамагчы бацькам сабраць нас у школу, мы падпрацоўвалі на зборы чарніц. Амаль кожны дзень на роварах ці пешшу пераадольвалі ад дому да лесу шлях больш як у сем кіламетраў. Заўсёды прачыналіся як мага раней, каб паспець знайсці ягаднае месца і выканаць запланаваную «норму». Яе кожны для сябе разлічваў сам у залежнасці ад таго, які заробак меў намер атрымаць. Увечары мы самі здавалі чарніцы і па справядлівасці дзялілі атрыманыя грошы. Важным момантам было тое, што ніхто ніколі не прымушаў нас хадзіць у лес, як і ніколі бацькі не імкнуліся ўключыць нашы грошы ў сямейны бюджэт. У сваю чаргу, і мы, малыя, ніколі не трацілі іх на глупствы, бо ведалі кошт кожнай капейкі. Напрыканцы лета хто-небудзь са старэйшых ехаў у раённы ці абласны цэнтр і набываў па нашых заказах неабходныя для школы рэчы. Калі на нешта не хапала, па магчымасці дакладвалі бацькі. І мы былі шчаслівыя як ад новых рэчаў, так і ад асэнсавання сваёй самастойнасці.

Не хацелася б, каб склалася думка, што маё дзяцінства прайшло толькі ў працы. Нягледзячы на ўсе гаспадарчыя клопоты, у нас заўсёды шмат часу заставалася на адпачынак. У вёсцы было шмат дзяцей. Кожны вечар цэлай гурбой мы збіраліся ў пэўным месцы і гулялі да цёмнага. «Жмуркі», «Святлафор», «Выбівала», «Зямля», «Банкі», «Сіньёр-памідор», «Казакі-разбойнікі» — пералік гульняў быў такі шырокі, што нам не хапала часу перагуляць ва ўсё. Рэальныя эмоцыі і запал тут проста віравалі: мы бегалі, аббівалі калені, плакалі і адразу смяяліся, шчыра радаваліся кожнай перамозе. У гульнях вучыліся быць камандай, падтрымліваць адно аднаго, не баяцца перашкод, верыць у сябе. Шчыра прызнаюся: сёння я нават не памятаю дакладна правілаў большасці пералічаных гульняў, але мне вельмі хацелася б у будучыні навучыць Васілісу хаця б некаторым з іх.

Наша дзяцінства было яркім і жывым. Мы ладзілі буданы, хадзілі на рыбалку, смажылі свой улоў на кастры і елі ўпрыкуску з бульбай, запечанай у мундзірах. На дэсерт ласаваліся палачкамі з мурашынай кіслатой. Нават у дні, калі ліў дождж, мы рэдка ўключалі стары лямпавы тэлевізар: у ход ішлі настольныя гульні ці кнігі, якіх дома ў нас — некалькі паліц. Мы чыталі захоплена, уяўлялі сябе галоўнымі героямі і ў думках перажывалі ўсе іх прыгоды...

Калі я стаў татам, у першую чаргу засяродзіўся на думцы, як стварыць найлепшыя ўмовы для жыцця сваёй сям'і. У пагоні за уладкаваным побытам і магчымасцю набываць для дачкі самыя лепшыя цацкі і вопратку я чамусьці забыў, што прыносіла сапраўднае шчасце мне ў дзяцінстве. Мой цесць часта гаворыць: новае пакаленне абавязана жыць лепш, чым іх бацькі. Не пагадзіцца з такімі словамі было б няправільна. Але мне вельмі хацелася б, каб гэта датычылася не толькі матэрыяльнай часткі.

Аляксандр АЛЕСІК

■ Захапленне

«Паляўнічы на прывідаў», або Рэтра-хвароба

38-гадовы жыхар Віцебска Яўген СМОЛЬСКІ займаецца рэстаўрацыяй старых аўто. Вучыць гэтаму 7-гадовага сына Ягора. У калекцыі захопленага чалавека каля дваццаці машын і амаль столькі ж матацыклаў і мапедаў. Рэстаўратар ужо паспеў зняцца ў кіно і робіць аўто для будучых здымак.

Яўген СМОЛЬСКІ: «Не ва ўсіх ёсць такі гіпертата».

А ЎСЁ ПАЧАЛОСЯ З «ГАРБАТАГА»...

Яго дом на ўскраіне горада адразу вылучаецца сярод астатніх. На фасадзе — частка бампера старой машыны. Аўто Яўгена не толькі ў гаражы, але і на вуліцы. Растлумачыў, што без даху — «донары», дэталі якіх выкарыстоўвае, каб стварацца выставачныя машыны.

— Стаў рэстаўратарам выпадкова. Аддаў у рамонт аўто. Мне не спадабалася, як навялі на ім «марафет». Майстры сказалі: калі такі разумны, сам паспрабуй. Ну я і паказаў, як бы я зрабіў. Пры гэтым, шчыра, я і не ведаў дробязяў тэхналогіі, нават якую назву маюць некаторыя інструменты. Адразу ўсіх здзівіў. У выніку аднаго з рабацяг звольнілі за дрэнную якасць працы... А па спецыяльнасці я дрэваапрацоўшчык і чырванадрэўшчык. Яшчэ ў дзяцінстве захапіўся тэхнікай. Пасля школы часта хадзіў па звалках і прыносіў дамоў «металалом». Бацька працаваў вадзіцелем грузавіка. Зарабляў добра і мог сабе дазволіць у той час раскошу ездзіць штодня на працу на таксі. І мяне часта вазіў на «Волзе» з жоўтымі шашкамі над кабінай. Гэта адзін з самых яскравых успамінаў майго дзяцінства. Яшчэ хлопчыкам я даў сабе слова, што ў мяне будзе менавіта такая ж «Волга». І вось яна стаіць, — распавядае Яўген.

Менавіта гэты «ГАЗ-24», упрыгожаны выявай карціны Рэпіна «Бурлакі на Волзе», стаў нядаўна пераможцам на міжнароднай выставе ў Гродне. Смольскі атрымаў кубак «Залаты поршань» — найвышэйшы пілатаж сярод аматараў. Гэты аўтамабіль больш за чвэрць века прастаяў у вільготным гаражы. Агульны прабег да таго, як яго купіў Яўген, быў невялікі — 15 тысяч кіламетраў. Захаваўся ў фактычна ідэальным для рэстаўратара стане.

— А першая рарытэтная машына ў маёй калекцыі з'явілася напрыканцы 1990-х гадоў. Вось гэты «ЗАЗ-965» вішнёвага колеру, які празвалі «гарбатым». Дарэчы, гэта — копія «Fiat-600», выраб якога пачаўся ў 1960 годзе. «Запарожац» каштаваў у эквіваленце 1000 бутэлек гарэлкі. Эканамічная машына, але з вельмі слабым рухавіком і цесным салонам. Задумаў «гарбатага» выкарыстоўваць разам з матацыклетным картэжам падчас вяселляў. Некалькі матацыклаў «Ява» ўжо ёсць. Яны таксама будуць вішнёвага колеру, — працягвае Яўгеній.

Ёсць у рэстаўратара і артылерыйскі цягач «ГАЗ-67» («Іван-Віліс»), трафейны «Опель» («Капітан»), зроблены ў 1935 годзе, два ўсюдыходы «Масквіч-410»...

Сын Смольскага Ягор — маленькі рэстаўратар аўто.

— Напэўна, ты і не ведаў, што такія джыпы існуюць! Іх, павер, знайсці складаней, чым славутую чорную «Чайку». А насамрэч «разыначка» з вялікай літары — «Масквіч-407» (купэ). Іх вырабілі ўсяго ў двух экземплярах — у 1960 годзе... А каб купіць вядомы «чорны варанок» — «ГАЗ-М-1», гадоў 6 гаспадара прасіў. У 1990-я гады за гэтую машыну мне тры кватэры ў Мінску прапаноўвалі. Не магу назваць дакладны кошт усёй калекцыі. Кожная машына для мяне неацэнная.

— Рэтра-аўтамабілі — гэта наша аўтамабільная культура і гісторыя. Колы былі не проста сродкам перамяшчэння, але і паказчыкам статусу ўладальнікаў. Я пра, напрыклад, вядомых пісьменнікаў, паэтаў, кампазітараў. Тую ж «Волгу» маглі сабе дазволіць купіць, напэўна, толькі лётчыкі, канструктары абароннай прамысловасці... У мяне, між іншым, ёсць і сапраўдная скураная куртка лётчыка. Трэба ж паказаць людзям усё ў «камплекце», таму збіраю і форменнае адзенне, антыкварыят, — працягвае распавядаць рэстаўратар.

Унікальны «Масквіч-407» (купэ).

ХОБІ ДЛЯ БАГАТЫХ?

Ён прызнаўся, што любоў да старых аўто — гэта хвароба, якая не лечыцца. Аматараў рэтра-тэхнікі яшчэ называюць «паляўнічымі на прывідаў».

— Мы ж шукаем тое, пра што ўсе чулі, але многія не бачылі. Або на вельмі рэдкія экземпляры гадамі палюем, — тлумачыць Яўген.

Ён канстатаваў, што такое хобі неабавязкова для багатых. Галоўнае, каб інтарэс быў і рукі з «правільнага месца» раслі.

— Але ж, вядома, запчасткі «родныя» каштуюць дорага. Вось цана такога новага «элемента» ад «Волгі-ўніверсала» — 500 долараў. Пра дзверы і іншае лепш не гаварыць. Дык паспрабуй яшчэ знайсці! Я шукаю і знаходжу, як і машыны. Дзе? Праз знаёмых, «армянскае радыё» спрацоўвае, аб'явы чытаю. У мяне, напэўна, дзясяткі тысяч розных гаек, вінтоў і іншага ад старых аўто. Так, можна і сучасны рухавік паставіць. Але мой прынцып: максімум «роднага» павінна быць у машыне. Таму і перамагаю на выставах, клубам кірую, — разважае старшыня віцебскага клуба «Аўтавіцязь». Ён сказаў, што ў свой час быў першым у Віцебску прадпрымальнікам, які займаўся вырабам дзвярэй. Зарабляў вялікія грошы, якія ахвотна траціў на пакупку аўто, а не кватэр, катэджаў.

У Віцебску гады два таму расійскія кіношнікі працавалі над фільмам пра вайну. Галоўную ролю грала «зорка» — Анастасія Заваратнюк. Яўген сыграў немца, які кіраваў грузавіком.

— Мяне папрасіў падагнаць грузавік мой добры знаёмы з «Беларусфільма», таксама рэстаўратар... Гэта не быў аўто таго часу. Здымалі заднюю часць «ГАЗ». Дарэчы, бывае смешна ў кінафільмах некаторыя кадры глядзець. У прыватнасці, генерал у ваеннай «кінахроніцы» выязіць з «Масквіча-401» 1956 года выпуску. Рэстаўратары і людзі, якія разбіраюцца ў старых машынах, фальш адразу заўважаць. Аўто трэба паказваць у арыгінале! — эмацыянальна гаворыць Яўген.

Ён працуе над стварэннем тэхнікі для здымак у кіно. Адпаведныя прапановы атрымлівае рэгулярна з розных студый. Але ўпэўнены, што спяшацца не трэба, каб не было сорамна перад калегамі...

У калекцыянера аўто былі планы стварыць у Віцебску музей-сховішча рарытэтных аўто з гурткамі для дзяцей па вывучэнні, аднаўленні рэтра-аўто і па аўтаспорту. Але зразумеў, што асаблівай зацікаўленасці ў прадстаўнікоў улады ў гэтым няма. Але ж ніхто не забараняе стварыць прыватны музей у тым жа гаражы? Зноў жа ёсць нюансы. Пачнеш квіткі прадаваць, дык падатковая прыйдзе...

Праўда ад сваёй ідэі Яўген не адмаўляецца. Ён упэўнены, што хай у перспектыве, але гэта ўсё будзе!

ТАТА «РАБОЧАГА ДНЯ»

Ёсць таты «выхаднога дня», а Яўген — «рабочага».

— Мы з маці майго сына жывем асобна. Ягор — будучы мужчына, якому неабходна мужчынскае выхаванне, таму палову тыдня сын жыве са мной. Мы з ім у цір ходзім, вучу трымаць правільна інструменты, рамантаваць нешта па дробязі. Важу сына на заняткі ў танцавальны гурток, у секцыю бокса... Навучыў кіраваць машынай, калі яму споўнілася тры гады. А чаму здзіўляешся?.. Мы любім адзін аднаго. Я з яго «ляплю» асобу. Выхоўваю, каб вырас сапраўдным мужыком, які можа даць адпор хаму, пастаяць за гонар жанчыны, будзе паважаць старшых. Не ва ўсіх ёсць такія гіпертаты, як я. Уяўляеш, якая самаацэнка *(смяецца)*? — здзіўляе Яўген.

Калі пачуў пра дамову з былой жонкай, успомніў цытату з фільма «Пакроўскія вароты». Памятаеце: «высокія, высокія адносіны».

— У Ягора, дарэчы, свая калекцыя. Не толькі маленькіх мадэляў, але і дзіцячых аўто. Упэўнены, ты такое не бачыў. У савецкі час былі машынкі з педалямі, якія дарылі толькі дзецям ці ўнукам высокапастаўленых чыноўнікаў, дыпламатаў... Вось паменшаная дакладная копія браніраванага «ЗІС-115». Ляжала яна дзесяткі гадоў у агародзе, нікому не патрэбная. Доўга я над ёй працаваў. І паспеў давесці да розуму да чарговага дня нараджэння сына. Скура на сядзенні італьянская, руль замяніў... Мне за яе прапаноўвалі 15 тысяч долараў. Адмовіў. І не мару, а ўпэўнены, што Ягор стане маім калегай. Прыемна, што ён цікавіцца тым жа, што і я, — канстатуе Яўген і радуецца, што будзе каму працягнуць любімую справу.

Калі ў вас, шаноўныя чытачы, ёсць аўтамабільны «хлам», звяртайцеся ў віцебскі карпункт. Для вас гэта проста «жалязяка», а на самой справе мо каштоўны «агрэгат» ад якога-небудзь рарытэтнага аўто.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by
Фота аўтара і з асабістага архіва Яўгена СМОЛЬСКАГА

■ Бацькоўскія клопаты

ЯК МЫ ШУКАЛІ ДЗІЦЯЧЫ САДОК

— Як?! Вы яшчэ не шукаеце дзіцячы садок? — здзівілася адна са знаёмых мам на мае словы аб тым, што я праз тры месяцы вяртаюся на працу пасля дэкрэтнага водпуску.

Быць мамай — няпростая справа. А каб сумяшчаць яе з працоўнымі буднямі, трэба, каб клопаты аб дзіцяці былі падзелены з кімсьці. І мы пачалі шукаць садок для нашага малога.

Фота Паліны МАСЛЯНКОВАЙ.

У новы мікрараён пераехалі паўгода таму. Прыгожы сучасны садок праз дарогу ад нашага дома не заўважыць цяжка. Вось куды будзе хадзіць наш Данька! Але не, «не зраслося» — туды дзяцей, мне так здалося, запісваюць адразу ў радзільні.

У нас былі афіцыйныя паперы для двух садкоў. Абодва далёка ад дома, даўно патрабавалі рамонту, не выклікалі асаблівых эмоцый. І мы вырашылі пашукаць шчасця ў трох новых садках нашага мікрараёна. З басейнам, спартыўнымі заламі і сучаснымі пляцоўкамі для гульні — мара адным словам. Аднак у двух заявілі катэгарычнае: «Месцаў няма. Групы перапоўненыя». Адзінае, што нам магло б дапамагчы, гэта праца выхавальніцай або нянечкай у гэтых садках. У трэцім месцы былі, але толькі за афіцыйную спонсарскую дапамогу. Грошы немалыя, але збянтэжыў нават не памер дапамогі. Высветлілася, што групу з 25 дзяцей даглядае толькі адна выхавальніца. А памочніцы ўвогуле няма. У дзіцяці не будзе асабістай шафы і спальнага месца. Таму гэты варыянт «адваліўся» сам.

Мы падумалі аб прыватным садку. Але ён, як высветлілася, нам не па кішэні. Дзяржаўны садок каштуе каля 500 тысяч рублёў у месяц, а прыватны — 450-500 долараў.

Так вярнуліся да прапанаванага нам па чарзе варыянта.

— Які прыгожы хлопчык! — словы выхавальніцы, якімі яна сустрэла нас, былі як бальзам на сэрца. — А мы цябе ўжо даўно чакаем. (Даня павінен быў прыйсці тыдзень таму, але хварэў.) Пакуль мы размаўлялі з выхавальніцай, сын паспеў пазнаёміцца з новымі сябрамі, і тыя хуценька далучылі яго да сваіх гульняў. Мы нават разгубіліся, калі наша дамашняе дзіця, не развітаўшыся, пабегла гуляць.

Спадабалася мне і парада выхавальніцы, якая сказала, што галоўнае — гэта прыводзіць сюды дзіця з лёгкім сэрцам.

Неўзабаве нас запрасілі на бацькоўскі сход. «Вось і пазнаёмімся з іншымі бацькамі, паглядзім, у якіх умовах наш хлопчык развіваецца», — аптымістычна разважала я. «Будуць грошай прасіць», — адрэзаў муж. Як у ваду глядзеў. А я патэлефанавала знаёмым мамам і пацікавілася, як у іх з матэрыяльнай падтрымкай садкоў. Высветлілася, што грошы збіраюць на рамонт далёка не ва ўсіх дашкольных установах.

За гэты час Даня пачаў прывыкаць да сада. З раніцы патрабаваў, каб яго хутчэй вялі да дзяцей. Пачаў прыкметна лепш размаўляць. Аднойчы я затрымалася на працы, прыйшла позна, іншых дзяцей ужо забралі. Наш быў апошнім. Выхавальніца несла Даню на руках. Ён даверліва абдымаў яе за шыю... Я нават крыху прыраўнавала. Але гэты выпадак красамоўны: сыну тут добра, яго тут любяць.

Мы перасталі шукаць «ад дабра дабра», бо галоўны крытэрый выбару дзіцячага садка не рамонт у ім, нейкія выгоды. Нават не блізкасць да дома. Галоўнае, каб дзіцяці было ў ім «цёпла» і камфортна. Тады і маё мацярынскае сэрца будзе спакойным. А значыць, у мяне будзе дастаткова часу для работы.

ПАРАДЫ БАЦЬКАМ

У які сад аддаць дзіця? Аднойчы такое пытанне ўзнікае ў кожнай сям'і. Будзе гэта садок санаторнага тыпу (пры наяўнасці медыцынскіх паказанняў); прыватны, калі дазваляе сямейны бюджэт; ведамасны, калі вы працуеце ў буйной арганізацыі, або дзяржаўны — вырашаць бацькам. Ажыятаж на дзіцячыя сады не праходзіць вось ужо некалькі гадоў. Таму да выбару дашкольнай установы падыдзіце з адказнасцю і загадзя.

1. Стаць на чаргу ў выканкаме на сад трэба адразу пасля нараджэння дзіцяці. Тады ёсць хоць нейкі шанц (заўважце, не гарантыя), што вы трапіце ў жаданы садок. Асаблівы дэфіцыт дашкольных устаноў — у раёнах новай забудовы. Пры сабе трэба мець пасведчанне аб нараджэнні дзіцяці і пашпарт аднаго з бацькоў. З гэтага дня вам будзе прысвоены парадкавы нумар у чарзе.

2. Найлепшы спосаб выбраць сад — паразмаўляць з бацькамі, чые дзеці ўжо наведваюць яго. Хто яшчэ раскажа, ці не злюка выхавальніца, што даюць на сняданак і абед і як дзеці бавяць час на вуліцы.

3. Можна і самой правесці «разведку боем». Не палянуйцеся абысці ўсе блізкія дзіцячыя сады. Агледзьце тэрыторыю вакол, заўважце, у якім стане дзіцячыя пляцоўкі. Звярніце ўвагу, як паводзяць сябе выхавальніцы на прагулцы. Калі яны зацікаўлена гутараць паміж сабой, у той час як дзеці вісяць уніз галовамі, — смела праходзьце міма.

4. Прыйдзіце на прыём да загадчыцы. Шмат можна зразумець з размовы з ёй. Запытайцеся пра рэжым працы, распарадак дня, як арганізаваны заняткі з дзецьмі, якія праводзяцца прафілактычныя і аздараўленчыя мерапрыемствы. Удакладніце, ці ёсць у садзе медсястра, лагапед, музычны кіраўнік, фізрук. Папрасіце правесці экскурсію ў адну з груп. Там вы зможаце ва ўсім пераканацца: ці хапае плошчы для гульняў, у якім стане спальныя месцы, ці шмат цацак, пазнаёміцца з меню малых. Звярніце ўвагу на зносіны дзяцей і выхавальніцы, памочніцы. Дзеці ходзяць за імі «хвосцікам», дурэюць або пабойваюцца. І не бойцеся задаваць пытанні. Вы маеце права ведаць усё пра месца, куды будзе хадзіць ваша дзіця.

5. Праштудзіруйце інтэрнэт-сайты і форумы. Там вы знойдзеце і водгукі аб дашкольных установах, і вопыт іншых бацькоў.

6. Шукайце сад бліжэй да хаты. Узважце, ці згодны вы будзеце кожную раніцу ўставаць на гадзіну раней, каб адвезці дзіця нават у вельмі добры садок на другім канцы горада.

7. Важны крытэрый — колькасць дзяцей у групе. Больш за 20 — ужо шмат, а значыць, мала ўвагі вашаму дзіцяці.

8. Выбіраючы дзіцячы сад, задумайцеся, ці так патрэбны вашаму малому 7-8 дадатковых заняткаў у дзень? Можа, варта ад чагосьці адмовіцца? Вопытныя педагогі сцвярджаюць, што да свядомага ўспрымання разнастайных «навук» дзіця гатова ў 5-6 гадоў, і няхай іх будзе не больш за чатыры-пяць на дзень. Вывучаць замежную мову, вядома, справа добрая. Аднак ранняе двухмоўе можа прывесці да затрымкі маўленчага развіцця і нават заікання.

Вам удалося знайсці ідэальны ва ўсіх сэнсах дзіцячы сад? Вы шчасліўчык. Калі ж не, то вылучыце найбольш важныя для сябе крытэрыі. Не ганіцеся за ўсімі выгодамі; можа быць, на нейкія паказчыкі можна заплюшчыць вочы. Нязменным застаецца факт, што дзіцяці ад 3-х гадоў значна лепш хадзіць у дзіцячы сад, чым сядзець дома з бабуляй або нянькай.

Яна ЛЫЧКОЎСКАЯ

■

■ Вазьму твой боль...

Прызванне цаной у жыццё

Даўно заўважыла парадаксальную несправядлівасць. У Цэнтр дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі часта трапляюць тыя, хто вядзе здаровы лад жыцця, займаецца спортам, актыўнічае, выносіць вялікія фізічныя нагрузкі і плануе зрабіць спартыўную кар'еру. Разам з пастаноўкай дыягназу яны перакрэсліваюць усе планы і хаваюць свае мары.

Барыс вучыўся на марака. Але саркома косці растаптала будучыню, звязаную з вадой. Ён ганарыўся сваім выбарам і нават не дапускаў размоў, што прыйдзецца нешта змяніць. Я марыла, каб ён выздаравеў, і адначасова баялася гэтага. Што ён стане рабіць, калі адмовіцца ад мараплаўства?

Памятаю, як у клініку прыехаў Лёшка гадоў васьмі. У яго таксама падазравалі остэасаркому. Ён кульгаў так, як і Бора. І хлопец адразу ўзяў апеку над Лёхам, шкадаваў яго, рыхтаваў да ўсяго, што прайшоў сам і што ў малога яшчэ наперадзе.

У першы ж вечар мы павялі Лёшку на прагулку ў лясок, каб максімальна скараціць час у бальнічных сценах. Ён яшчэ ўскараскваўся на лясныя ўзгоркі, няспрытна бегаў паміж сасонак. А Борка сумна ўсміхаўся яму ўслед, кульгаючы сваёй пратэзаванай нагой.

Хлопцы правялі мяне да прыпынку, і, развітваючыся, я спытала ў Лёшы:

— Што табе прывезці ў наступны раз?

— Мячык, — не раздумваючы, выдаў ён.

Гэтае звычайнае, гарэзліва прамоўленае слова ўскалыхнула Барыса. Ён разгубіўся, захістаўся, потым узяў сябе ў рукі і насмешліва перапытаў: «Мячык? Што ты будзеш з ім рабіць?».

Калі я прыехала ў анкацэнтр наступны раз, Лёшы там не было. Бора расказаў, што падазрэнні на анкалогію ў хлопчыка не апраўдаліся і яго адправілі лячыцца ў раённую бальніцу.

— Куды ж мне цяпер падзець мячык? — я пастукала па вялікім пакеце.

— Мячык? — Бора перапытаў з такім жа здзіўленнем, як тады ў Лёшы на прыпынку.

Я і цяпер бачу той позірк. Ён глядзеў на футбольны мяч, быццам ужо сапраўды не ведаў, для чаго ён патрэбен і што з ім можна рабіць. А вусны горка ўсміхаліся, узгадваючы, як калісьці Барыс марыў стаць мараком.

...Памятаю, як дзядзька Ваня прасіў мяне ўгаварыць яго сына Алеся забраць дакументы з універсітэта фізкультуры і перапаступіць на іншую спецыяльнасць. Здаравенны хлапец спартыўнага целаскладу бачыў сябе толькі фізруком. Ён не хацеў мірыцца з дыягназам і верыў, што хворае плячо не перашкодзіць яго кар'еры.

Я асцярожна размаўляла з Алесем аб прафесіях, паступова ўводзячы ў вушы, што выбар вялікі і яго талентаў хопіць, каб рэалізавацца ў нечым іншым.

Прывяла яго на радыёстанцыю, дзе ў той час працавала, правяла экскурсію. Потым ён не прапускаў ніводнага майго эфіру, нават запісваў іх і пераслухоўваў. Аналізаваў і дзяліўся ўражаннямі. Аднойчы я запісала з ім невялічкае інтэрв'ю і выкарыстала ў сваёй радыёперадачы. Алесь даў запіс бацьку і сказаў, што той можа ганарыцца ім. А потым сказаў мне: «Магчыма, я таксама стану журналістам».

Я не магу расказаць вам, як склаліся лёсы Барыса і Алеся пасля хваробы, якую прафесію яны выбралі і з чым звязалі лёс. Іх не стала раней, чым настала дарослае жыццё. Магчыма, мора і спорт сапраўды былі іх прызваннем, і жыццё пашкадавала хлопцаў, назаўсёды пакінуўшы ім іх мары.

Але ёсць і іншыя прыклады. Алег быў апантаны дзвюма рэчамі: Германіяй і ўсім, што з ёй звязана, і сваім родным атрадам МНС. Да хваробы ён збіраўся стаць выратавальнікам. Актыўны, вясёлы хлапчына падтрымліваў суседзяў па палаце сваімі жартамі, зараджаў бадзёрасцю. Алег слухаў «Рамштайн», практыкаваўся ў нямецкай мове, спрачаўся пра палітыку еўрапейскай краіны. І адначасова прымяраў чырвона-зялёную форму, з радасцю прыгадваў, як дзяжурыў на тэлефоне 01, і з гонарам паказваў фотаздымкі каманды.

Алегу таксама паставілі пратэз на назе. На тушэнне пажараў і лажанне па вяровачных лесках можна было адразу забыцца. Ён яшчэ нейкі час падтрымліваў сувязь з тымі, хто так і не стаў калегамі, прымаў званкі на дыспетчарскай станцыі. А вучыцца пайшоў на юрыста.

Цяпер Алег працуе маркетолагам у футбольным клубе і зусім не шкадуе пра тое, як склалася яго жыццё. Ён задаволены сваёй працай, зацікаўлены ў справе, якую робіць. А апантанасць нямецкай мовай натуральна перайшла ў любоў да сваёй, беларускай. У межах сіл і дадзеных паўнамоцтваў Алег змагаецца за ўкараненне беларускай мовы ў спорце. Неўзабаве ён плануе ажаніцца і таксама прывіваць сям'і любоў да роднага. Ён шчаслівы, што ўсё атрымалася менавіта так.

Магчыма, цяжкая хвароба ўратавала Алега ад няправільнага выбару, падказала, куды павярнуць і як жыць. Можа, для гэтага яна яму і давалася.

Я не ведаю дакладна, ці існуе прызванне для кожнага чалавека ад нараджэння. Але ўсе мы сустракалі доктара, да якога лепш не трапляць, і, наадварот, такога, які лечыць ужо адным словам. Неаднаразова чулі гісторыі пра тое, як бацькі навязвалі дзецям выбар прафесіі і тым самым калечылі лёс, і, наадварот, як своечасова заўважаная дзіцячая схільнасць перарастала ў справу на ўсё жыццё. Але калі ўсё ж існуе чалавечае прызванне ад нараджэння, тады, магчыма, хворыя спартсмены — гэта не здзек лёсу, а спосаб адшукаць сваё сапраўднае зямное прызначэнне.

Таццяна НЕМЧАНІНАВА,
заснавальніца дабрачыннага руху «Клуб 5000»

■

ЖЫВЫ ХЛЕБ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Вераніка бярэ слоік з рэшткамі закваскі, падкормлівае яе (дадае муку і ваду, добра вымешвае). Ставім дзве ёмістасці, накрытыя вільготнай марляй, расці ў цёплае і цёмнае месца. Заўважыла, што Вераніка ўсё робіць інтуітыўна, на вока. Не адмярае колькасць мукі, вады, цукру...

— Выпечка жывога хлеба, смак, знешні від, колькасць кампанентаў — працэс вельмі творчы. Таму, калі вы ўсё ж такі вырашыце балаваць сваіх сямейнікаў рэгулярна, не бойцеся эксперыментаваць. Можна ў рошчыну дабавіць некалькі лыжак мёду, сушаныя лісты мяты, а замест вады выкарыстаць адвары зёлак... Адным словам, праяўляйце фантазію, не абмяжоўвайце сябе дакладнымі рэцэптамі, і тады працэс гатавання абавязкова прынясе вам задавальненне.

КРОК ТРЭЦІ: цеста

У той вечар мы дамовіліся, што праз 10 гадзін я вярнуся, і мы будзем разам пячы хлеб...

— Хлеб не любіць спешкі і мітусні, — з парога настройвае мяне на патрэбны лад Вераніка. — Для таго, каб ён атрымаўся, трэба пячы яго ў асаблівым духоўным стане, з добрым настроем. На кухні павінна быць суха, цёпла і ціха. Кожную бурбалку, якая падымаецца, варта берагчы. Калі тупаць (падлога ж дрыжыць), хлеб можа асесці. І даверся сваім адчуванням. Самае галоўнае, каб не было хвалявання: «А раптам не атрымаецца, а раптам не падымецца». Недарэмна ж кажуць, што думкі матэрыялізуюцца. Мы чамусьці не надаём гэтаму значэння.

Пачалося ўсё з таго, што заўважыла: як паем дражджавога хлеба з крамы — адчуваю цяжар у страўніку, і вельмі хочацца салодкага. Калі ж перайшла на самапечаны, самаадчуванне палепшылася.

У міску з рошчынай, якая за ноч істотна падгулялападрасла, падсыпаем муку.

— Лепш змяшаць жытнюю і пшанічную (цэльназерневую), — кажа Вераніка і пры гэтым акуратненька вымешвае цеста драўлянай лыжкай. — Калі пячы на адной жытняй, то хлеб будзе ліпкім.

— Як зразумець, што цеста ўжо набрала мукі столькі, колькі трэба? — удакладняю.

— Яно пачынае «дыхаць»-пыхкаць. Чуеш? Цеста павінна быць густым і прыліпаць да лыжкі. Але не тугім, бо хлеб будзе цяжкім і дрэнна падымецца.

Пакуль цеста адпачывае, Вераніка ставіць закваску (гэта і ёсць так званая «вечная закваска», якой можна дзяліцца з сябрамі) у халадзільнік (у самае цёплае месца) да наступнага разу. Затым бярэ металічную форму, прагравае яе і змазвае таплёным маслам (можна і звычайным сметанковым). Пасыпае панiровачнымі сухарамі і выкладае цеста. Крыху менш за палову формы (улічваючы, што яно падымецца недзе ў два разы). Выраўноўваем паверхню цеста мокрымі пальцамі. Накрываем вільготнай марляй (каб хлеб не трэскаўся, не падсыхаў), наверх — махровы ручнік, ставім у цёплае месца і чакаем, пакуль яно не падымецца і не выгнецца, як каромысел. На гэта спатрэбіцца ад адной да трох гадзін. Вельмі важна, каб цеста добра паднялося, а на паверхні сталі праглядвацца скразныя адтуліны бурбалак, тады хлеб атрымаецца порыстым і пышным.

«Мякіш, як порысты шакалад, павінен быць увесь у бурбалках ад нізу да верху».

КРОК ЧАЦВЁРТЫ: хрумсткая скарынка з ільняным алеем і соллю

Не пужайцеся, зусім не абавязкова ўвесь гэты час сядзець і дыхаць над хлебам. Займіцеся сваёй справай. Мы з Веранікай, напрыклад, пакуль чакалі, калі цеста падымецца, цудоўна правялі час. Яна аказалася вельмі цікавым чалавекам. Мае сертыфікат чайнага майстра і аўтарскую калекцыю фітагарбат з беларускіх зёлак са спецыямі. Дзякуючы ёй я ўпершыню ў жыцці пакаштавала збіцень (малочны напой са спецыямі на адвары канюшыны і лісця шыпшыны — выдатны сродак ад прастуды, дарэчы). А таксама розныя віды квасоў, настоеных на зёлках. Яны выдатна наталяюць смагу і вельмі карысныя, у тым ліку для кішэчніка. Даведалася шмат цікавага пра льняную макуху, розныя гатункі мукі, адкрыла для сябе цудоўную індыйскую прыправу зіра (кумін), якую Вераніка люшыся фіналу, бо рызыкавала спазніцца на апошні аўтобус. Але спартыўны інтарэс не дазволіў гэтага зрабіць. Тым больш узгадала, як смачна ўчора Вераніка распавядала пра цёплую хрумсткую скарынку, якую мы будзем паліваць ільняным алеем і пасыпаць соллю...

Праяўляйце фантазію, не абмяжоўвайце сябе дакладнымі рэцэптамі, і тады працэс гатавання абавязкова прынясе вам задавальненне.

Ставім форму ў добра разагрэтую духоўку. І выпякаем 35-40 хвілін пры тэмпературы 250 градусаў, праз хвілін 15 можна трошкі паменшыць тэмпературу (да 180-160).

— У маёй вучаніцы скарыначка ўвесь час трэскаецца зверху. Тут таксама ёсць розныя хітрыкі. Некаторыя гатуюць адмысловы кісялёк (заліваюць 1 чайную лыжку крухмалу 200 мл вады, і кіпяцяць), якім змазваюць вярхушку хлеба. Я ж, калі мяняю тэмпературу падчас выпечкі, апырскваю яе вадой... Трэскаецца ж чаму? Бо сохне. Можна таксама паставіць у духоўку місачку з вадой.

І вось — такі доўгачаканы момант. Выключаем духоўку, чакаем хвілін 10 і дастаем хлеб з пылу з жару. Вераніка акуратненька вымае яго з формы, змочвае рукі ў вадзе і «ўмывае» бохан. З хлеба ідзе ледзь заўважная пара, і прыемным водарам напаўняецца ўся кватэра.

Вераніка адразае скарынку. Смаката! Хлеб з жытняй мукі — як цукерка, як пернік... Самы найлепшы ласунак, што я каштавала ў жыцці.

— І з часам такі хлеб становіцца толькі лепшым, смачнейшым, — усміхаецца Вераніка. — Ён хутчэй насычае і доўга захоўваецца. На сваім хлебе, у адрозненне ад пакупнога, не з'яўляецца цвіль. Спачатку ён можа здацца вельмі мяккім, і нават узнікаюць сумненні, ці дапёкся. Таму раяць не рэзаць хлеб цёплым, а даць гадзін 4-8 пастаяць, пасля чаго ён і рэзацца будзе выдатна, і не будзе ліпнуць. Але калі я пачынала выпякаць, кожны бохан надразала, глядзела, ці добра прапёкся. Як зразумець? Мякіш, быццам порысты шакалад, павінен быць увесь у бурбалках ад нізу да верху.

Я вярнулася дадому позна, але шчаслівая: з жытняй мукой (якую паспела за некалькі хвілін да закрыцця набыць у краме), металічнай формай для хлеба і вечнай закваскай, якімі са мной падзялілася Вераніка.

P. S. *Так супала, што свой першы хлеб я спякла якраз у Хлебны Спас. Вераніка казала, што ў большасці ён спачатку не атрымліваецца. А ў мяне з Божай дапамогай атрымаўся! Цэлы тыдзень жыла гэтым. Спяшалася дадому, каб своечасова падкарміць закваску. Не думала пра вынік, а атрымлівала асалоду ад працэсу: назірала за бурбалкамі, чакала з нецярпеннем ранку, каб замяшаць цеста, натхнялася неперадавальным водарам у кватэры. Муж, калі пакаштаваў мой хлеб, шчыра здзівіўся: «Я і не думаў, што ў табе таіўся такі патэнцыял пекара»... Сябру з Санкт-Пецярбурга, які якраз гасціў у нас, ён таксама прыйшоўся даспадобы. Тым не менш пайшоў у краму і набыў... бездражжавы хлеб. Маўляў, для параўнання. З'еў адзін кавалачак, а потым моўчкі адсунуў убок і працягваў смакаваць мой, жывы. Бо ніякі крамны, канвеерны хлеб не параўнаецца з тым, у які ўкладзена душа...*

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.
dryla@zviazda.by
Фота аўтара і Аляксандра ШАБЛЮКА.

І закваска, і рошчына любяць цеплыню.

Цеста Вераніка вымешвае выключна «жывой» драўлянай лыжкай.

Не запаўняйце форму цалкам. Улічвайце, што цеста падымецца недзе ў два разы.

Будучы хлеб выгнуў «спінку».



Той самы хлеб, што сілу дае!

■ Тэхналогіі для жыцця

АДХОДЫ, ЗДАВАЙЦЕСЯ!

Як выглядае «вядро» для зручнага сартавання смецця?

Ці выкідваеце вы ўпакоўку з-пад малака, спісаны сшытак альбо бутэльку з-пад ліманаду ў асобныя пакеты? Банальная лянота і нежаданне «замарочвацца» часам забіваюць гэтую звычку. У такія моманты нават забываюся, што сартаванне — не экалагічны капрыз. Перапрацаваныя адходы могуць атрымаць другое жыццё, вызваліць палігоны ды сэканоміць рэсурсы, даць зямлі магчымасць дыхаць вальней.

Удзельніца ініцыятывы «Чыстая справа» Надзея РЫНКЕВІЧ выкарыстоўвае для сартавання звычайныя скрыні з-пад абутку. Шкло дзяўчына выкідвае ў спецыяльны кантэйнер, які стаіць каля дома. Сметніц для іншых відаў адходаў, акрамя змяшаных, у двары няма. Таму даводзіцца «выкручвацца». Сёлета думка пра зручны хатні кантэйнер для адходаў аформілася ў бізнес-праект, які затым перарос у сацыяльную ініцыятыву. Студэнты чацвёртага курса эканамічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Ілья Калчанаў, Валянцін Дашкевіч, Надзея Рынкевіч, Настасся Кміт сустрэліся ў Школе прадпрымальніцтва і менеджмента БДУ і з лёгкай рукі выкладчыцы па эканаметрыцы аб'ядналіся ў «Чыстую справу».

— Нам прапанавалі паўдзельнічаць у алімпіядзе стартапаў, якая праходзіла ў Маскве сёлета ў красавіку, — распавядае Надзея. — На той момант Ілья і Валянцін ужо мелі ідэю наладзіць вытворчасць зручных урнаў для сартавання адходаў у хатніх умовах. Канструкцыя вельмі простая: круглае вядро, падзеленае на чатыры часткі рознага колеру: сіняя — для шкла, жоўтая — для пластыку, зялёная — для паперы, чырвоная — для змяшаных адходаў. Дызайн прыдумалі самі, папярэдне азнаёміўшыся з вынаходкамі нашых папярэднікаў.

Раздрукаваўшы дэманстрацыйную мадэль на 3D-прынтары, «Чыстая справа» адправілася на алімпіяду ў Маскву, дзе іх ініцыятыва атрымала добры водгук. Аднак, нягледзячы на поспех, студэнты зразумелі: задумку са сметніцамі ў Беларусі немагчыма рэалізаваць як паспяховы бізнес-праект.

Часта даводзіцца чуць: навошта сартаваць адходы, калі я на свае вочы бачыў, што смеццявоз загружае ўсё разам? Аб практыцы дасартавання смецця, вядома, людзі не ведаюць.

— Мы гутарылі з прадстаўнікамі завода «Белпласт». Яны пагадзіліся наладзіць вытворчасць пры ўмове, калі за месяц будзе прададзена не менш за 5 тысяч кантэйнераў, — адзначае Ілья. — Зразумела, што такога попыту на вядзерцы ў нашай краіне папросту няма. Людзей, якія сартуюць адходы, у Беларусі вельмі мала, а тых, хто гатовы аддаць грошы за прыладу для асобнага збору, яшчэ менш.

Такім чынам задача «Чыстай справы» змянілася: каманда вырашыла сфарміраваць попыт на хатнія сметніцы. Іншымі словамі, студэнты-эканамісты захацелі зрабіць сартаванне адходаў звычнай для беларусаў справай. Тым больш, па іх назіраннях, людзі не супраць атрымаць такія веды. Многія хочуць пачаць, але не ведаюць, як зрабіць гэта правільна.

Круглае вядро, падзеленае на чатыры часткі: такім бачаць хатні кантэйнер для адходаў.

Надзея РЫНКЕВІЧ сартуе смецце. А вы?

Фота Надзеі БУЖАН.

— Часта даводзіцца чуць: навошта сартаваць адходы, калі я на свае вочы бачыў, што смеццявоз загружае ўсё разам? Аб практыцы дасартавання смецця, вядома, яны не ведаюць, — адзначае Ілья. — Каб такія пытанні не ўзнікалі, трэба расказваць папулярна.

Удзельнікі «Чыстай справы» вывучалі вопыт асобнага збору адходаў у іншых краінах. Германія і Швейцарыя не за адзін дзень прыйшлі да наладжанай сістэмы — для гэтага ім спатрэбілася 40-50 гадоў. Але пачыналі яны з навучання як дарослых, так і дзяцей.

— Прывяду адзін прыклад: у Еўропе нават кухні зроблены такім чынам, што пад мыйкай ёсць некалькі розных скрынь для розных відаў адходаў. Гэта стандарт. А ў нас, калі чуюць пра асобны збор адходаў дома, кажуць: «У мяне на кухні і так месца няма, куды я буду выкідаць?». Пакуль людзям цяжка ўсвядоміць, што смецця больш не стане, проста яно будзе ў розных адсеках складвацца. Гэта сведчыць аб тым, што мы знаходзімся ў самым пачатку шляху ў пытанні асобнага збору.

Пачаць адукацыйную кампанію вырашылі з дзяцей — гэтая аўдыторыя найбольш адкрыта да ўспрымання новых ведаў. У першыя тыдні верасня «Чыстая справа» пачне праводзіць у школах азнаямляльныя заняткі па сартаванні смецця. Ідэю маладых людзей у саміх адукацыйных установах прымаюць «на ўра». Студэнты распрацавалі тры праграмы, разлічаныя на розныя ўзроставыя катэгорыі. Яны пазнаёмяць з асновамі асобнага збору другакласнікаў, шасцікласнікаў і васьмікласнікаў — усяго завітаюць у 9 сталічных школ. Актывісты пастараюцца пазбегнуць сухой інфармацыі, а ў кабінетах установяць урны для пластыку і паперы. Над кожным вядром для смецця будуць вісець запамінальныя тлумачальныя карцінкі.

— У нас няма задумы абысці ўсе школы Мінска — мы хочам паглядзець на рэакцыю дзяцей, бацькоў, настаўнікаў, — кажа Валянцін. — Таксама ўстановім кантэйнеры і ў нас на факультэце, паглядзім, што з гэтага выйдзе.

Ужо сёння экалагічная ініцыятыва атрымала падтрымку ад зацікаўленых калег. Напрыклад, беларуска-нямецкае прадпрыемства па абыходжанні з адходамі «Рэмондыс Мінск» гатова бясплатна ўстанавіць у школах кантэйнеры для змяшаных адходаў і другасных матэрыяльных рэсурсаў. Некамерцыйная грамадская арганізацыя «Экапартнёрства» дапамагае інфармацыйнымі матэрыяламі: іх «Гісторыя пра адходы» пакладзена ў аснову ўрокаў.

У Еўропе нават кухні зроблены такім чынам, што пад мыйкай ёсць некалькі розных скрынь для розных відаў адходаў. Гэта стандарт. А ў нас, калі чуюць пра асобны збор адходаў дома, кажуць «у мяне на кухні і так месца няма, куды я буду выкідаць?»

Ілья падкрэслівае, што даследаванне эксперыментальнае. Па яго выніках «Чыстая справа» напіша справаздачу ў Міністэрства адукацыі і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольля з прапановай аб стварэнні курса па экалогіі, на якім дзяцей навучылі б сартаваць адходы. Каманда збіраецца і далей актыўна праводзіць інфармацыйныя кампаніі. Як толькі людзі навучацца сартаваць адходы, «Чыстая справа» вернецца да першапачатковай задумы: будзе прасоўваць хатнія вядзерцы для адходаў.

Кацярына РАДЗЮК.
radziuk@zviazda.by

■ Вусы, лапы, хвост

Даўгавухі энерджайзер

Калі ў сабакі пераходны ўзрост...

Выбіраючы сабаку для падлетка, не варта арыентавацца толькі на жаданні будучага гаспадара. Напрыклад, мінчанін Ваня ПАЛЕВІКОЎ марыў пра хаскі. Старэйшая сястра Юля вырашыла ашчаслівіць хлопца. І на свой дванаццаты дзень нараджэння Ваня атрымаў двухмесячнага бігля — ён значыўся на другой «прыступцы» жаданняў. Сабака паляўнічай пароды аказаўся з характарам...

Раней у сям'і быў кокер-спаніэль, з якім ладзілі ўсе — гэта яркі прыклад кампаньёна, які з кожным знойдзе агульную мову. Іншая справа — біглі: прадстаўнікі гэтай пароды не будуць проста так служыць гаспадару, яны яшчэ падумаюць, слухацца яго ці не. З першых дзён шчаня пачало дысцыплінаваць сваіх гаспадароў. Для пачатку сабака пагрыз тэлефон і зарадку. Пасля дабраўся да сцен. Паеў усе кветкі.

— Заводчыкі адразу папярэдзілі, што сабаку трэба трымаць у клетцы, але для мяне гэта быў нонсэнс, — узгадвае Юля. — Пасля таго, як Арчыбальд пагрыз дзверы, давялося набыць яму такое часовае жытло, і тады сабака зразумеў, дзе яго месца. Цяпер яму ўжо год, паводзіць сябе больш прыстойна, таму трымаць яго ў клетцы ўжо не трэба.

Шчанюком Арчы паспяваў паесці па тры разы на дзень, таму дзеці запомнілі, што ежу нельга пакідаць без нагляду. Цяпер яны кладуць яе на на сярэдзіну стала, бо калі пакласці з краю, гэта справакуе сабаку сцягнуць смакату.

І ў Вані, і ў Арчы зараз, так бы мовіць, пераходны ўзрост, і ў гэтым іх падабенства. Даўгавухі сябар яшчэ малы, таму не надта слухаецца свайго гаспадара. Але спіць з ім разам на канапе. Увогуле, ён любіць паказаць характар. Напрыклад, Арчы не любіць заставацца адзін і таму помсціць: хаваецца і доўга не паказваецца. Сабакі гэтай пароды вельмі энергічныя і без актыўнасці не вытрымліваюць: з імі трэба праводзіць як мінімум 2-3 гадзіны на выгуле. Інакш жывёла пачынае дурэць і шкоднічаць.

Арчы вельмі любіць гуляць з дзецьмі.

Фота Надзеі БУЖАН.

Хоць на Арчы наракаюць (маўляў, непаслухмяны), ён усё ж паддаецца дрэсіроўцы, па камандзе садзіцца і дае лапу. На вуліцы яго трымаюць на павадку, бо, адчуўшы свабоду, сабака можа страціць кантроль. Бігль вельмі любіць авантуры, прыгоды, таму не дзіва, што з ім цяжка справіцца. Часам ён настолькі захапляецца пошукамі, што можа забыцца пра чалавека.

— Бігль, калі бачыць слабасць гаспадара, мае здольнасць кіраваць яго дзеяннямі, — кажа **кінолаг Андрэй ШКЛЯЕЎ**. — У маёй практыцы сустракаліся выпадкі, калі сабакі што хацелі, таго і дабіваліся ад сваіх гаспадароў. Каб выхаваць бігля, ні ў якім разе не трэба патураць яму, не давайце і маленькай магчымасці атрымаць усё, што ён захоча. А вось упартасць і незалежнасць — яркія рысы «сышчыка», вельмі патрэбныя на паляванні.

Свавольнік заўжды разумее, калі ён вінаваты. Сабаку «караюць» ігнараваннем. Арчы хаваецца ад гаспадароў, а праз некаторы час, «падумаўшы» над сваімі дзеяннямі, вяртаецца, як быццам нічога і не здарылася.

Аднойчы вушастаму выпала сабачае шчасце. Бабуля Вольга дастала з лядоўні палку каўбасы, і тут ёй патэлефанавалі. Ведаючы, што Арчы спіць, яна спакойна пайшла пагутарыць. А калі вярнулася, той ужо расправіўся са смакатой. Пасля далікатэсу яго званітавала, бо звычайна кормяць сабаку выключна сухім кормам. Аднак гэта не перашкаджае Арчыбальду красці агуркі ў чарапахі, цікаваць за кавалкамі кавуна ці марожанага.

Кінолагі раяць звадзіць бігля на паляванне, аднак Арчыбальду пакуль што пашанцавала пабываць у паходзе, дзе ён праявіў сябе як вартаўнік і павадыр — вёў за сабой Юлю і яе дачку Варвару.

Асаблівага догляду, акрамя інтэнсіўных прагулак і дрэсіроўкі, ён не патрабуе: нават купаць бігляў можна толькі два разы на год, гэта вельмі ахайныя сабакі. Чысціць поўсць раз на тыдзень і абавязкова правяраюць доўгія вушы.

Можна сказаць, што Арчы — цяжкі падлетак, якому вельмі патрэбна ўвага: ён заўжды далучаецца да дзіцячых гульняў. Біглю пакуль ўсяго год, Ваня і Юля стараюцца не патураць ягоным капрызам, бо, як вядома, ад выхавання і навучання сабакі залежыць, якім ён вырасце.

ЯКІМІ ЯКАСЦЯМІ МУСІЦЬ ВАЛОДАЦЬ САБАКА-КАМПАНЬЁН?

Для такой ролі падыходзяць жывёлы сярэдняга ці малога памеру, з якімі зможа справіцца любы член сям'і, з неагрэсіўным характарам. У сабакі мусіць быць поўсць, якая не патрабуе асаблівага догляду. Ён не павінен быць звышэнергічным. На ролю сабакі-кампаньёна кінолагі раяць выбіраць лабрадораў, дэкаратыўных спаніэляў, пудзеляў, памеранскіх шпіцаў, мопсаў.

Кацярына РАДЗЮК. *radziuk@zviazda.by*

■ Аліментная справа

МОЙ ТАТА — НЕВІДЗІМКА...

Ухілісты, якія не жадаюць падтрымліваць сваіх дзяцей, застануцца без мабільнай сувязі і інтэрнэту

Чатырохгадовы Вадзік свайго бацькі не памятае. Той кінуў маці, калі хлопчыку было ўсяго паўгода. Незарэгістраваны шлюб, зрабіць гэта было нескладана. А цяпер Віктар не плаціць на ўтрыманне сына ні капейкі, хоць экспертыза ДНК пацвердзіла яго бацькоўства.

Калі не атрымліваецца вырашыць пытанне па згодзе, то варта падаць пазоў аб спагнанні з яго аліментаў, параіла я сваёй знаёмай. Ірына гэта зрабіла, рашэнне судом вынесена, але яна чакае выплат некалькі месяцаў. Віктар у Мінску з'яўляецца рэдка. Афіцыйнага месца працы ў яго няма. Ён увогуле, нібыта чалавек-невідзімка. Хоць і нябедны. На мабільны тэлефон траціць у месяц столькі, што хапіла б малому на адзенне і абутак.

І вось цяпер такім, як гэты гора-бацька, давядзецца перагледзець жыццёвыя прыярытэты. Як заўважае **першы намеснік міністра юстыцыі Беларусі Валерый КУЛАКОЎСКІ**, у апошні час судовыя выканаўцы атрымалі магчымасць адключаць даўжнікоў ад сотавай сувязі. Правяраецца па базе, ці ёсць у даўжніка мабільны тэлефон, і ў выпадку неабходнасці ўводзіцца забарона на аказанне аператарам адпаведных паслуг, а таксама арыштоўваюцца і спісваюцца грошы з рахунку.

Таксама судовыя выканаўцы маюць тэхнічную і заканадаўчую магчымасць уводзіць забарону на прадастаўленне для даўжнікоў паслуг інтэрнэту. Гэтыя меры, як вы разумееце, выкарыстоўваюцца ў дачыненні да нябедных хітруноў, якія не жадаюць падтрымліваць сваіх дзяцей.

А ўвогуле, у Беларусі да аліментшчыкаў падыход строгі. У іх вылічваюць грошы не толькі з зарплаты, а з усіх відаў даходу. А яшчэ могуць забраць вадзіцельскія правы. І часовае пазбаўленне камфортнага перамяшчэння на аўто таксама актывізуе тых, хто не жадае ўтрымліваць дзяцей і разлічыцца з даўгамі.

Так, **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па заканадаўстве Уладзімір ЧАРАВАЧ** узгадаў выпадак са сваёй практыкі, калі ён быў старшынёй суда Кастрычніцкага раёна сталіцы. Адзін «татка» завінаваціўся больш за сем мільёнаў рублёў аліментаў. І вось аднойчы судовыя выканаўцы ўбачылі, як ён на шыкоўнай машыне пад'язджае да суда, куды яго выклікалі па аплаце штрафу за парушэнне правілаў дарожнага руху. На аўтамабіль быў накладзены арышт, выклікалі эвакуатар, каб даставіць яго на штрафпляцоўку. Як ні абураўся нядобрасумленны бацька, але, каб не заставацца без «колаў», вымушаны быў на працягу гадзіны (!) пагасіць запазычанасць, у тым ліку няўстойку — 0,3% ад сумы за кожны дзень пратэрміноўкі.

Акрамя забароны на карыстанне аўтамабілем, у злоснага «ўхіліста» могуць канфіскаваць маёмасць або накласці на яе арышт (у тым ліку на грашовыя дэпазіты). Неплацельшчыку таксама не дазволяць выехаць за межы Беларусі, пакуль запазычанасць не будзе пагашана. Яшчэ яму могуць забараніць карыстацца маламернымі суднамі, а таксама паляваць. Выключэнне зроблена толькі для інвалідаў і тых, для каго вышэйзгаданае з'яўляецца адзіным сродкам атрымання даходу.

— У нас у гэтай галіне выстраена дакладна палітыка, — адзначае парламентарый. — У прыватнасці, згодна з артыкулам 91 Кодэкса аб шлюбе і сям'і, бацькі абавязаны ўтрымліваць дзяцей да 18 гадоў, а калі яны непрацаздольныя, то і пасля паўналецця. Такое, каб хтосьці гадамі хаваўся і не плаціў аліменты на сваё дзіця, бывае нячаста. Пра гэта сведчыць і статыстыка. Так, у мінулым годзе ў аддзелах прымусовага выканання толькі 6% выканаўчых дакументаў тычыліся аліментных выплат.

Вера ПАКРОЎСКАЯ.

«ХЭПІ-ЭНД» З СУМНЫМ АСАДКАМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Як любая маці, Ганна строіць планы, уяўляе, як ён пачне хадзіць, як вымавіць першыя словы. Пра тое, што яе могуць разлучыць з сынам, яна старалася не гаварыць. Але ж нервознасць і напружанасць усё роўна выступалі, іх цяжка было схаваць зусім. Калі загаварылі на тэму хрышчэння, Ганна сказала: «У мяне пытаюць часам, чаму я не хрышчу Косціка. А навошта гэта рабіць у бальніцы? У бальніцы дзяцей хрысцяць, толькі калі яны хворыя, калі... Ну, самі разумееце. А мы будзем дома, у нас жа царква побач, нават везці не трэба: можна малога занесці, можна бацюшку ў кватэру запрасіць. Дома трэба хрысціць, каб прыгожа ўсё, каб запомнілася...»

Ужо другі месяц яна знаходзілася ў бальніцы з малым, і гатовая была, здаецца, цярпець яшчэ колькі заўгодна, толькі б урэшце ўсё скончылася і можна было забраць сына дадому.

«У мяне пытаюць часам, чаму я не хрышчу Косціка. А навошта гэта рабіць у бальніцы? У бальніцы дзяцей хрысцяць, толькі калі яны хворыя. А мы будзем дома, у нас жа царква побач».

Фота БЕЛТА.

Марыяна ШЧОТКІНА: «Трэба падтрымліваць жанчын, матываваных на мацярынства».

Я была ў Ані ў чацвер. А ў пятніцу з'явілася інфармацыя, што заключэнне ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі, згодна з якім інваліды першай групы Ганна і Анатоль Бахуры не могуць выконваць бацькоўскія абавязкі, адменена. Можна было б паставіць кропку. Але так не атрымліваецца. Таму што шмат чаго давялося пачуць не толькі ад самой Ганны, але і ад іншых людзей, у тым ліку ў калідорах улады, што надта хвалюе. Афіцыйныя каментары таго дня прыводзіць няма сэнсу, з прыняццем рашэння яны страцілі актуальнасць. А пра рашэнне райвыканкама адносна сям'і Бахур, прынятае ў пятніцу, мне расказаў **Аляксандр ВЕЛІКАСЕЛЕЦ, намеснік старшыні райвыканкама:**

Косцік застаўся з бацькамі.

— Рашэннем райвыканкама для сям'і, якая трапіла ў складаную жыццёвую сітуацыю, адкрылі стаўку нянькі. Для зручнасці работнікаў будуць прыняты на працу дзве жанчыны, на паўстаўкі кожная.

Вось і знайшлося рашэнне. І вельмі разумна, што нянькі дзве, па чарзе яны будуць хадзіць на выхадныя. Але ж відавочна, каб не ўмяшанне міністра Марыяны Шчоткінай, віцэ-прэм'ера Наталлі Качанавай, іншых афіцыйных асоб, дзіця бацькам не аддалі б.

Прыводжу кароткі дыялог у Івацэвіцкім райвыканкаме ў мінулы чацвер:

— Яна не можа выконваць бацькоўскія абавязкі, — гаворыць адзін з чыноўнікаў.

— Але яна іх выконвае ўжо месяц, — кажу я.

— А што нам скажа пракурор?

І гэта, здаецца, апошні жалезны аргумент улады: нехта некага абавязкова пакарае, калі не будзе зроблена па напісаным. Дзіця, яго маці, сям'я тут — справа дзясятая, галоўнае выканаць пастанову. Яшчэ прыводзіўся такі аргумент наконт немагчымасці нянькі, пра якую загаварылі ў кантэксце гэтай гісторыі. Нянька — чалавек, наняты на працу, яна не будзе адказваць, калі дзіця, не дай бог, разаб'е нос. А, напрыклад, апекуна можна прыцягнуць да адказнасці. Цікава, калі дзіця падае і разбівае нос у звычайнай сям'і, ніхто да адказнасці не прыцягваецца. Выходзіць, дыскрымінацыя?

Яшчэ ў Івацэвічах даводзілася чуць такую прапанову: калі ўжо радавому раённаму выпадку надаюць вялікую ўвагу ў сталіцы, то хай бы забралі маму з дзіцем у адну са сталічных клінік і правялі экспертызу наконт таго, можа яна выконваць свае мацярынскія абавязкі ці не. А чаму для гэтага трэба везці сям'ю ў сталіцу? Ці не прасцей было б адправіць іх дадому, а потым работнікам апекі зайсці ды паглядзець? Калі дзіця, умоўна кажучы, галоднае, нямытае, у хаце вэрхал, то вось вам і падстава, каб забраць яго з сям'і. А калі малы чысты, накормлены і дагледжаны, то не трэба і сталічных спецыялістаў для вынясення таго самага «прысуду» іх сям'і.

І яшчэ. Складваецца ўражанне, што прывыклі ўсе адзін аднаго пужаць пракурорам, аж смешна становіцца. Пракурор яшчэ нічога не збіраўся казаць, а ўжо дрыжаць ад яго магчымага прадпісання. А што, калі ён зараз спытае: навошта трымалі фактычна прымусова столькі часу жанчыну з дзіцем у стацыянары? У бальніцы людзі, як вядома, знаходзяцца па медыцынскіх паказаннях, а не па чыноўных загадах. Хутчэй за ўсё, ніхто нікога не будзе пытаць, і ўсё неўзабаве забудзецца пра гучную гісторыю. Як у тым анекдоце: дарэмна баяліся.

У гэтай гісторыі самае прыкрае, самае абсурднае, самае брыдкае, што мне давялося чуць: «Ёй жа прапаноўвалі зрабіць аборт, яна адмовілася».

Пішу гэтыя радкі зусім не для таго, каб паказаць, якія ў Івацэвічах дрэнныя чыноўнікі. Якраз не горшыя за іншых сваіх калег. А чаму такая сітуацыя склалася ў адным асобна ўзятым райцэнтры? Думаю, таму што мы такія. Усё грамадства. На жаль, мы яшчэ не дараслі да цывілізаванага стаўлення да інвалідаў. Нібы саромеемся, што побач крыху іншыя людзі. Традыцыя гэтага здрадніцкага сораму каранямі ўрасла ў свядомасць з савецкіх часоў. І гэта не лепшая спадчына савецкага мінулага. Тады інвалідаў наогул як быццам не было. Яны сядзелі ў дамах, кватэрах, ніхто не клапаціўся пра безбар'ернае асяроддзе для іх. Цяпер загаварылі, пачалі будаваць пандусы, спецыяльныя поручні і нават асобныя санвузлы ў грамадскіх месцах. На словах клапоцімся, на справе часта застаецца па-ранейшаму. І на работу могуць не ўзяць, каб не псаваць офіснай карцінкі (не разбіраючыся, наколькі ў таго ці іншага чалавека магчымасці абмежаваныя). А ў гэтай гісторыі самае прыкрае, самае абсурднае, самае брыдкае, што мне давялося чуць: «Ёй жа прапаноўвалі зрабіць аборт, яна адмовілася». Выходзіць, правільна адмовілася, нарадзіла здаровае дзіця, якое, трэба думаць, стане падарункам яе няпростага лёсу, сэнсам жыцця і апорай у старасці.

Пішу яшчэ для таго, каб і ў іншых гарадах асцярожна падыходзілі да справы, вынікам якой можа быць разбурэнне сям'і. Галоўнае права дзіцяці — быць з бацькамі, якія яго любяць. Пра гэта варта памятаць. Гэта ж не першы ў краіне выпадак, калі бацькі-інваліды выхоўваюць сваё дзіця. Такія сем'і можна знайсці ў кожным горадзе. Яўген Семяновіч з Баранавіч, сын інвалідаў, напісаў нават адкрыты ліст у падтрымку сям'і Бахураў. Тут, праўда, справа ўскладняецца тым, што абое — інваліды першай групы. Але ж інваліды таксама бываюць розныя. У дакументе запісана, што не могуць такія людзі выконваць абавязкі бацькоў. А калі асобныя ўсё ж могуць, то не трэба пазбаўляць іх гэтай радасці.

...Аня атрымлівала віншаванні, адказвала на іх крыху разгублена і сумбурна, сказала: «Добра, што ва ўрадзе нашым ёсць жанчыны» і што нарэшце ўсё вырашылася, што яна ўдзячная ўсім, хто яе падтрымліваў. Застаецца пажадаць іх сям'і шчасця.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
yackevich@zviazda.by
Івацэвіцкі раён.

■ Магія аўтастопа

САПРАЎДНАЕ КАХАННЕ НА ДАРОЗЕ НЕ ВАЛЯЕЦЦА

Яно па ёй падарожнічае

Непрадказальнасць, прыгоды і адрэналін — бадай што самыя асноўныя складнікі падарожжа аўтастопам, што вабяць да сябе няўрымслівых і апантаных людзей. Цуд яго ў тым, што ты ніколі не ведаеш, дзе апынешся. Ранкам можаш мокнуць пад дажджом пасярод лесу, а ўвечары — з новымі знаёмымі частавацца ласункамі ў катэджы. Паспытаўшы смак вольнай вандроўкі раз, адмовіцца ад гэтага занятку ўжо немагчыма — ты прагнеш новых падарожжаў.

У такіх рамантычных і цікавых, а часам і няпростых абставінах жыцця ў дарозе нараджаюцца адносіны, сяброўства і каханне. Так здарылася і ў нашых герояў: Надзеі і Ільі, якія ўпершыню ўбачыліся за дзень да сумеснага падарожжа аўтастопам на Каўказ, а праз пару месяцаў пажаніліся.

ЖАДАННІ ЗДЗЯЙСНЯЮЦЦА

Калі азірнуцца на год назад і паспрабаваць зразумець, як усё адбылося, то відаць, што сустрэча маладых людзей — гэта яго вялікасць Выпадак, калі супалі абставіны, жаданні і, пэўна, умяшаўся сам лёс.

У Надзеі Насенкі за плячыма быў 10-гадовы вопыт аўтастопа. Ездзіць пачала з 16-ці і ўжо наведала Расію, Украіну, Польшчу, Літву, Германію, Бельгію, Галандыю, Люксембург. Яна часта шукала спадарожнікаў праз адпаведныя суполкі ў інтэрнэце, аднак ні разу так і не дамовілася да сумеснага падарожжа. Звычайна адпраўлялася ў паездкі з сяброўкай ці агульнымі знаёмымі. Для Ільі Данілава гэта стала першым вялікім выпрабаваннем сябе. Дагэтуль ён ездзіў аўтастопам толькі па Беларусі.

— Год назад я звольнілася з працы і перад уладкаваннем вырашыла з'ездзіць хоць куды. Зноў шукала спадарожнікаў, аднак з тымі, хто адгукнуўся, не супадалі то маршруты, то патрабаванні да паездкі, — успамінае Надзея. *— Нарэшце мы з сяброўкай паехалі ў Пецярбург, і калі ўжо вярталіся назад, пазваніў Ілья, які прапанаваў рвануць у Кыргызстан на тры тыдні. Я яму растлумачыла, што такога тэрміну недастаткова, і калі прыдумае нешта іншае, хай зноў звоніць.*

Праз нейкі час дзяўчына забылася на званок, аднак бліжэй да верасня Ілья прапанаваў паехаць на Каўказ. Надзея да апошняга не верыла, што гэта атрымаецца, бо вельмі хацела ў такое падарожжа і нават планавала некалькі разоў, але заўжды нешта перашкаджала.

— У мяне з дзяцінства была мара — убачыць горы са снежнымі вяршынямі. Я думаў, што калі не зраблю гэтага, то і памяраць буду з тугой ад няздзейсненага, — падзяліўся Ілья. *— Аднойчы выпадкова зайшоў на сайт аўтастопшчыкаў і зразумеў, што гэта якраз тое, што мне трэба. Вырашыўшы звярнуцца па дапамогу да спрактыкаваных людзей, я знайшоў паведамленне Надзеі.*

Парады пачаткоўцам

✓ Не баяцца і верыць у поспех.

✓ Давяраць інтуіцыі і адчуваць настрой вадзіцеля: ці хоча ён, каб вы гаварылі, або лепш пасядзець моўчкі.

✓ Калі едзеш ноччу, ні ў якім разе не спі! Гэта пытанне бяспекі.

✓ Ні ў якім разе не ездзіць выпіўшы!

✓ Аўтастопам можна вандраваць увесь год: галоўнае — ведаць, што цябе чакае ў пэўнай мясцовасці ў той час, калі ты туды збіраешся.

«Я ВАС БЛАСЛАЎЛЯЮ»

Напярэдадні паездкі мінчанка і хлопец з Гродзеншчыны ўпершыню ўбачыліся літаральна на 15 хвілін, каб абгаварыць «працоўныя» моманты:

— Ты для мяне проста спадарожнік, мы едзем разам, але ніякіх заляцанняў.

— Дамовіліся. Мне ўвогуле цікава на горы паглядзець, а не на цябе.

За 20 дзён падарожжа Надзея і Ілья праехалі Пяцігорск, Чачню, Дагестан, Азербайджан, Грузію, Каўказ, Сочы. Маршрут прыйшлося карэкціраваць на хаду, як часта і бывае ў аўтастопе. Пачаўшы прыгоды як незнаёмыя людзі, на радзіму яны вярнуліся ўжо як пара.

Першыя некалькі дзён былі звычайныя: маладыя людзі мянялі машыны, абмяркоўвалі дарожныя моманты. Затым пачаліся акалічнасці. Спачатку знайшлася машына, у якой яны ехалі ажно суткі. Пакуль вадзіцель адпачываў, яны гулялі па палях. Пасля шафёр-азербайджанец спытаўся ў аўстастопшчыкаў, ці чакае іх хто дома. Атрымаўшы станоўчы адказ, выдаў незвычайнае: «Раз вы кінулі сваіх палавінак, то яны вам і не надта патрэбны, усё ў вас атрымаецца. Я вас бласлаўлю».

Тады гэта здавалася смешным, але менавіта ў Баку, дзе два дні Ілья і Надзея гасцявалі ў азербайджанца, і нарадзілася іх каханне.

— Магчыма, гэта нейкая магія аўтастопа здарылася. Для мяне тое падарожжа стала такім, пра якое я заўжды марыла. Яно было спантанным, маршрут мяняўся, але ўрэшце я адчула, што так і павінна быць, а Ілья — мой чалавек, — падзялілася Надзея. *— Ён, як і я, у любы момант можа сарвацца і паехаць вандраваць.*

— Я да гэтага не разумею, як усё так склалася. Мы спачатку баяліся, як нашы адносіны вытрываюць выпрабаванне побытам і адлегласцю (па размеркаванні Ілья тады працаваў у Аршанскім раёне. — **Аўт.**). *— Але ўсё неяк упарадкавалася, я атрымаў перавод у Мінск, і мы сталі жыць разам.*

ВЯСЕЛЛЕ БЕЗ СВЕДАК

Праз тры тыдні пасля падарожжа маладыя людзі гулялі па Лошыцкім парку. Надзея раптоўна сказала: «Давай пажэнімся». Сказана — зроблена. Яны падавалі заяву ў ЗАГС у Карэлічах, адкуль родам Ілья, але яе не прынялі — матывавалі адмову неабдуманым рашэннем маладых людзей. Тады яны прыйшлі ў ЗАГС Мінска і спыталіся: «Калі можна пажаніцца як мага хутчэй?».

14 лістапада, праз тыдзень пасля гэтага, без цырымоніі і сведак, адразу пасля адкрыцця ЗАГСа яны сталі мужам і жонкай.

Сваякі даведаліся пра «вяселле» значна пазней. Маці Надзеі — праз месяц ад дачкі, а маці Ільі ўвогуле атрымала вестку пра шлюб сына ад агульных знаёмых ледзьве не праз паўгода. На маладых ніхто не крыўдуе (першы шок даўно прайшоў), і матулі нават ганарацца сваімі непрадказальнымі і арыгінальнымі дзецьмі.

— Цяпер я адчуваю, што жыву сваім жыццём. Мой любы чалавек падтрымлівае мае жаданні, і ў нас адны мары на дваіх. Разам з тым я не адчуваю сябе жонкай у літаральным сэнсе, якая завіхаецца па гаспадарцы і плануе колер шпалераў ці памеры мэблі.

— Я шчаслівы ад таго, што мы разам, і ад таго, што нашы жаданні супадаюць. На жаль, магчымасці не заўсёды дазваляюць ім здзяйсняцца. Вось прыйшлося адпусціць Надзю з сяброўкай у Адэсу, бо я атрымаў толькі два тыдні водпуску замест месяца. Тады і зразумеў, што такое перажыванні за жаноцкі аўтастоп. Але ж утрымліваць яе я не меў права.

«НАЗБІРАЙ ГРОШАЙ І ПАЕДЗЬ, ЯК НАРМАЛЬНЫ ЧАЛАВЕК»

Аўтастоп — рэч умоўна бясплатная, бо, як ні круціся, а нейкія сродкі ў цябе павінны быць, ці мала што здарыцца? Можна прынцыпова не браць з сабой ні капейкі, але тады трэба спадзявацца на волю нябёсаў ці зарабляць у дарозе.

— Некаторыя спрабуюць зарабіць спевамі і танцамі. Калі зусім нічога не ўмееш, прапануй дроў накалоць, разгрузіць нешта, проста дапамагчы па гаспадарцы, — разважае Надзея. *— Я ведаю адну дзяўчыну, якая ў дарозе майструе некія вырабы, а ў горадзе іх прадае за «хто колькі дасць». З іншага боку, колькі грошай не возьмеш, усё роўна іх расходуеш. Скажам, хочаш ты піць. Калі ёсць грошы, ты купіш піва, а калі няма, то папросіш у гаспадароў вады, знойдзеш калонку ці крыніцу. Увогуле, чалавеку не так шмат трэба, як нам навязваюць стэрэатыпы.*

— Мама спачатку казала мне: «Назбірай грошай і паедзь, як «нармальны чалавек». Але ж пакуль будзеш іх збіраць, яны могуць стаць не сродкам дасягнення мары, а мэтай. Штосьці спатрэбіцца набыць, камусьці пазычыш. І проста апынешся ў коле. Таму аўтастоп — спосаб быць вольным. Да таго ж у падарожжы можа ўсякае здарыцца. Прапануюць, напрыклад, папрацаваць валанцёрам ці застацца на сезонныя работы, падчас якіх можна таксама вандраваць па гэтай краіне, — дадае Ілья. *— Часам глядзіш на нейкую прыгожую замалёўку з белым пясочкам ды акіянам, уздыхаеш, марыш, а многім і ў галаву не прыходзіць, што ты ж можаш там пабываць. Збірайся, галасуй і падарожнічай.*

Ілья — інжынер-электрык, абслугоўвае кандыцыянеры ў радзільных дамах. Па начах працуе адміністратарам у забаўляльным цэнтры свайго брата. Надзея — сацыяльны педагог у сталічным прытулку. Абаім праца падабаецца, але ж вандроўкі вабяць больш. Кажуць, на вясну запланавалі падарожжа ў Азію працягласцю на паўгода ці больш. Дарэчы, нядаўна сям'я Данілавых вярнулася з двухтыднёвага падарожжа ў Малдавію і Карпаты.

— Я не ведаю, якім будзе наша жыццё далей, але я не хачу быць чалавекам з патухлымі вачыма, якіх я часам сустракаю на вуліцах, — упэўнены Ілья.

— Думаю, калі я вярнуся пасля гэтай вандроўкі, стану ўжо другім чалавекам, — разважае Надзея. *— Пакуль што я прагну новых пачуццяў і мясцін і не ведаю, ці прыйдзе час, калі я скажу, што не хачу больш нікуды ехаць.*

Ірына СІДАРОК

■



Ілья і Надзея ў сёлетнім падарожжы па Карпатах.

Аўтастопшчык на дарозе, як дома.

Дарожныя байкі сям'і Данілавых

• Самы цудоўны аўтастоп быў у Дагестане. Ледзьве падымеш руку — спыняецца па дзве машыны, вадзіцелі добразычлівыя, цікавяцца, адкуль мы, хто. Аднак там нас і напужалі. Першы раз, калі мы селі, я прышпіліўся, а мяне шафёр адшпільвае. Я бачыў, што яны ўсе непрышпіленыя ездзяць, але настойваю на сваім: «Мне жыццё даражэй». А ў адказ: «Табе гэта не дапаможа», і як націсне на газ да 200-220. Тут у мяне і мову адняло, і жыццё перад вачыма прайшло. А ў іх 140 — гэта нармальная хуткасць, як у нас 90. Прычым вадзіцелі носяцца незалежна ад маркі аўто і яго магчымасцяў.

• У Грозным мы знайшлі праспект Пуціна і пачалі там здымацца, як раптам нас паклікалі паліцэйскія. Пытаюцца: «Чаму ты ў шортах?». «Дык спёка ж, 35 градусаў!» «На цябе глядзяць нашы сёстры, матулі, гэта дрэнна. Ёсць у што пераапрануцца?» Зразумела, я пайшоў порткі нацягваць, але не адышоў і пары крокаў, як з той жа заўвагай падышлі мясцовыя хлопцы, яны ж нам дапамаглі і за горад выехаць.

• У Чачні мы паставілі намёт на ноч у лесе, а тут галасы нейкія, гоман, крыкі. Я вырашыў паглядзець, што адбываецца, і раптам — стрэлы. Я на зямлю ўпаў, думаю, няўжо і праўда вайна пачалася? А нас усю дарогу ад Каўказа палохалі: «Чаго вы ў Чачню прэцеся, хіба не ведаеце, што там адбываецца? Здадуць вас на працу на цагляны завод ці кукурузу лушчыць адправяць». Аказалася, быў Дзень незалежнасці, а стрэлы — салют. Але ж добразычліўцы нас так накруцілі, што мы гатовы былі ў самае горшае паверыць.

Мара здзейснілася: Ілья знайшоў свае снежныя вяршыні.

■ Фотаздымак з гісторыяй

ЗДРАДА

Вырашыла напісаць пра сваіх бацькоў. Мой тата Ягор Ціханавіч (1907 г.н.) і маці Ніна Іванаўна (1912 г.н.) нарадзіліся ў вёсцы Мхінічы Краснапольскага раёна. Пажаніліся яны ў 1931 годзе і з'ехалі ва Украіну, на Данбас, — зарабіць грошай, каб вярнуцца і пабудаваць дом. Абое працавалі ў шахце. У 1932 годзе нарадзіўся сын, праз год — дачка. Быў вялікі голад, і мама пачала пухнуць. Дачку карміла грудным малаком, магчыма, ад яго тая і памерла ў 9 месяцаў...

Дзецям давалі паёк. А маме — не, бо яна не працавала. Хлеб прывозілі адзін раз на тыдзень. Мама была слабая, але пайшла на працу, каб атрымліваць паёк. Шахцёрам давалі аднаразовы суп. Голад перажылі, збіралі грошы, у 1937 годзе ў іх нарадзілася яшчэ адна дачка — Марыя. Ішла размова, што будзе вайна, і мае бацькі вырашылі, што трэба з'язджаць. «Другі голад мы не перажывем».

У 1938 годзе вярнуліся на радзіму і пачалі будаваць дом. Але пачалася вайна ў Фінляндыі... І бацьку забралі. Калі ён вярнуўся з вайны, пачалі дабудоўваць дом. Грошай не было, прадалі швейную машынку. У 1941 годзе бацьку забіраюць на перападрыхтоўку на тры тыдні. А праз тыдзень пачалася вайна... Дзе ён праходзіў тую перападрыхтоўку, мы не ведаем... Не паспеў, відаць, ён нам даслаць пісьмо...

У 1941 годзе (27 верасня) нарадзілася я. У акопе. Нашы ў гэты час адступалі, а немцы наступалі. Ішлі баі, у хаце было небяспечна знаходзіцца. Ды і яе яшчэ не паспелі дабудаваць. Дакладней, печкі і вокнаў не было, але цэгла для печкі ляжала. Дабудоўвалі без бацькі. Стаялі ў нас у вёсцы немцы, бо непадалёку знаходзіўся карны атрад. У Журавах, што ў чатырох кіламетрах ад нас, жыла бацькава сястра. Яна даведалася нешта пра бацьку і перадала праз некага, каб мая маці прыйшла да яе. Хадзіць было небяспечна, але мама пайшла. Цётка сказала ёй: прыйшоў Жораў Іван з вайны і паведаміў, што іх полк разбілі і што ён быў разам з маім бацькам... Магчыма, і ён прыйдзе, можа, паранены, а можа, і загінуў. Пайшла мама да гэтага Жорава, але дома яго не аказалася. (Ён на дзень ішоў у лес — баяўся немцаў, бо могуць забраць.) Вось што сказаў Іван сваёй жонцы: «Ехалі мы, дайшлі да ракі, і нам далі каманду спыніцца. Маўляў, немец далёка, разбірайце стралковую зброю і чысціце, а потым будзем перапраўляцца на той бок. Сядзім, чысцім... Чуем, самалёты гудуць. Мы галовы задралі, глядзім, раты раскрылі, думаем, нашы ляцяць, а гэта нямецкія самалёты. І пасыпалася нам на галовы... Нам не было чым стрэльнуць, усе бегалі, крычалі: «Здрада! Нам здрадзілі!». Разбілі ўсё, што ў нас было. Я жывы застаўся, сядзеў пад бартавой машынай. Самалёты паляцелі, я вылез і пачаў клікаць Ягора: «Базыль!». Тры разы крыкнуў, але ён не адгукнуўся, і я пайшоў у той бок, адкуль ляцелі самалёты. Прайшоў трохі і бачу: ідуць танкі нямецкія, а за імі немцы. Я папоўз убок. Танкі і немцы пайшлі на тое месца, дзе быў разбіты наш полк. Што яны там рабілі, я не ведаю — разглядаць не было калі. І вось прыйшоў дадому».

Мама яшчэ раз хадзіла — яго таксама не было дома. Потым хацела схадзіць на ноч, але мая бабуля яе не пусціла, сказала: «Бацькі няма, і цябе немцы заб'юць. Што я тады буду рабіць з траімі дзецьмі?»

Іван Жораў у лесе далучыўся да партызанаў... З вайны ён не вярнуўся. Так і не ведаем дагэтуль, дзе было тое пабоішча, на якім да гэтага часу ляжаць косці, урослыя ў зямлю. Іх там ніхто не хаваў, бо, як казаў Жораў, вёскі паблізу не было.

Вось так мы і пражылі: самі дабудоўвалі дом, галадалі, у школу хадзіла ў лапцях да трэцяга класа. Паведамлення аб смерці не было. Падавалі запыт, прыходзіў адказ: прапаў без вестак. Плацілі

нам па страце кармільца палову сумы. Раз прапаў без вестак, дык казалі: можа ён дзе жывы ды шыкуе ў Амерыцы. Мама хварэла, быў мокры плеўрыт, лячылі народным сродкам: чорную рэдзьку з газай на хворы бок прыкладвалі.

Неяк прывезлі прадуктовыя пасылкі з Амерыкі. У каго бацька прапаў без вестак, таму не давалі, і нам у тым ліку. Плакала мама каля сельсавета, і, гледзячы на маму, плакалі і мы.

Другі раз, калі прыйшлі іншыя пасылкі, сказалі, што гэта адзенне, будуць даваць усім, у каго загінуў бацька. Прынеслі дадому, давай мераць, глядзець, а яны паклалі адзін бот 44 памеру, а другі 40. Звязаны ўсе, як трэба. Адзін чаравік, адна сандаля або пара з адной нагі, і такой уся партыя пасылак была, якая прыйшла да нас у Мхініцкі сельсавет. Абменьваліся людзі, як маглі. А калі што, то так і насілі: і дарослыя, і дзеці. Вось і дапамагла Амерыка! Гэта ж насмешка, разважце самі.

Дарагая рэдакцыя, высылаю фотаздымак свайго бацькі *(на фота ён справа)*, які ён прывёз з Фінляндыі. На другой картачцы — я і мама. Сястра Марыя абрэзала сябе — яна дрэнна атрымалася, за ёй быў брат Грыша. Фатаграфаваліся ў 1949 годзе. Грошай не было, дык фатограф браў яйкамі. За дзясятак сфатаграфаваў.

Валянціна ДАНІЛАВА,
г. Краснаполле, Магілёўская вобласць

Шаноўныя чытачы! Конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавых фота з сямейнага альбома (за выключэннем леташніх здымкаў з курорта, вясельных фотасесій і сучасных фота дзяцей). Вам ёсць што паказаць і расказаць? Давайце пагартаем сямейныя альбомы разам! Фотаздымкі з гісторыяй (не больш за тры) дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а або info@zvyazda.minsk.by. Аўтар найлепшага фота з гісторыяй будзе адзначаны прызам. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца аўтарам.

■ Маміны дзённікі

Закончыла расказваць Ані гісторыю на сон.

Яна пытаецца:

— А паклон будзе?

— Паклон?

— Вось, напрыклад, у танцы заўсёды ёсць паклон. Ты цяпер расказала гісторыю без паклону.

— У літаратуры гэта завецца эпілог. Заключныя словы пасля аповеду.

— Давай назавем гэта лепш паклонам...

* * *

Аня:

— Я так баюся, што мяне аднойчы хтосьці папросіць драпаць пазногцямі лёд, і я падрапаю ўсе свае пазногці!

* * *

Зрабіла Ганначцы сюрпрыз: падарыла дзіцяці тое, што яна не прасіла, але вельмі хацела. Заходзім у аўтобус, кажу:

— Давай, можа, пакладзем усё ў маю сумку?

— Мама, спраўдзілася мая мара, няўжо можна мару пакласці ў нейкую чорную сумку???

* * *

Аня:

— Сёння вечар нейкі сабачны.

— Чаму?

— Ну вось, кнігу пра сабак чыталі. Я кнігай уразілася, вось і кажу — вечар сабачны!

* * *

Аня глядзіць на свой аўтапартрэт і кажа:

— Падобна. І нос як... сукеначка.

* * *

Ганначка:

— Мама, у цябе такі голас мяккі.

— Мяккі?

— Так, вельмі мяккі.

— А ў астатніх?

— Таксама мяккі.

— Атрымліваецца, ва ўсіх мяккі?

— Не, толькі ў нашых сваякоў мяккі.

— А ў суседзяў цвёрдыя галасы?

— Не, не цвёрдыя. Але і не мяккія. У іх — тоўстыя галасы.

* * *

Даша на пытанне «Навошта чалавеку вуха?» заўсёды дае адзін і той жа адказ:

— Слухаць мора ў ракавінцы!

* * *

Ганначка:

— Мама, калі па праўдзе, да свайго нараджэння я думала, што ў мяне мама будзе горшай, чым ты цяпер.

* * *

Ганначка:

— Мама, я б ужо хацела, каб у мяне была маленькая дачушка і я б з ёй рабіла ўсё, што ты робіш са мной.

Занатавала мінчанка Наталля СЯЛЕЦКАЯ

■ Сямейная кухня

Шчыра радуюся і настальгую

Калі я была маленькай, вельмі любіла атрымліваць паперовыя лісты. Памятаю, штодзень па дарозе са школы падбягала да цёткі Лены, якая разносіла пошту, з адным пытаннем: «А мне што-небудзь ёсць?» І нават калі атрымлівала адмоўны адказ, з надзеяй правярала паштовую скрыню: «А раптам яна памылілася...». Цяпер асабістыя паведамленні я атрымліваю, як правіла, па электроннай пошце. Таму штораз, калі Таццяна Іванаўна з аддзела лістоў, прыносіць чарговы канверт у адрас «Сямейнай газеты», шчыра радуюся і настальгую... Дзякуй вам, даражэнькія! Пішыце часцей!

І не толькі на конкурс «Фотаздымак з гісторыяй». Актыўней далучайцеся да нашай «Сямейнай кухні». Дзяліцеся сваімі назіраннямі, жыццёвым досведам, тым, што хвалюе. Спрачайцеся з аўтарамі артыкулаў, задавайце пытанні, паведамляйце, пра што вам было б цікава прачытаць у наступных нумарах. А мо вы, як Кацярына Курачова і яе сабака-спартсмен пароды хаскі, не супраць трапіць на старонкі «Сямейнай» у якасці герояў? Дарэчы, менавіта Каця ў сацыяльных сетках падзялілася, на мой погляд, цікавым назіраннем:

ГЭТА Ж ДЗІЦЯ!..

«Усё больш пачынае раздражняць адмазка некаторых бацькоў «Гэта ж дзіця!» У транспарце карапуз топчацца па сядзенні. «І што цяпер? Вунь, глядзіце, я змахну пясочак далонькай. Гэта ж дзіця!» У краме хлопчык бегае паміж паліц, скідае тавары, некаторыя падбірае і цягне ў рот. Не купляць жа татку цяпер пакамечаны снікерс! А вы не заўважыце і купіце. «Гэта ж дзіця!»

Раніцай у метро матуля прайшлася чаравікамі малога па ўсіх пасажырах, пакуль несла яго да выхаду. Выпацкала і мае светлыя нагавіцы. Цесна, стамілася, з торбамі, не заўважыла — усё разумею. Але яна проста паглядзела мне ў вочы, прыняла ножкі дзіцяці і стала ля выхаду! Ні «прабачце», ні вінаватай усмешкі. Нічога! Кажу: вы б хоць прабачэння папрасілі... Яна ў адказ: «Што?! У цябе нага адсохла ці што ад гэтага? Гэта ж дзіця!..»

ХТО І НЕ ЎМЕЕ — НАВУЧЫЦЦА

«Сёння тэлебачанне можна папракнуць. Напрыклад, нават у выхадныя па многіх праграмах ідзе шмат фільмаў пра розных злачынцаў. А хочацца ж і іншага: паглядзець стары добры фільм, паспачуваць герояў лірычнай драмы альбо пасмяецца з цікавай камедыі.

Я, зразумела, не заклікаю ўвесці цэнзуру, але пэўныя абмежаванні павінны быць, — піша Аліна ВОЗНЕВА з Магілёва. — Бо тэлепрадукт спажываюць і дзеці, у якіх жыццёвыя прынцыпы толькі фарміруюцца. А пра стужкі, што, нібыта «майстар-клас», паказваюць, як дасягнуць жаданага любой цаной, мая старэнькая мама сказала вельмі трапна: «Хто і не ўмеў — навучыцца».

БУДЗЬЦЕ ПОБАЧ... ПА-САПРАЎДНАМУ

Цэнтр псіхалагічных даследаванняў у Кітаі распрацаваў выдатную сацыяльную рэкламу (на фота). Слоган «The More You Connect The Less You Connect» («Чым больш вы звязаныя, тым менш вы звязаныя») красамоўна гаворыць аб сённяшніх рэаліях: калі вы побач са сваім дзіцем, будзьце па-сапраўднаму з ім. «Вельмі ў кропку, — лічыць матуля дваіх дзетак з Мінска Саша МЯСНІКОВА. — Кожны дзень назіраю, як мамы адрываюцца ад гульняў з дзецьмі, каб адказаць на апавяшчэнні ў сацыяльных сетках або «навіны пагартаць». Напэўна, таму ў мяне да гэтага часу не смартфон, а звычайная «гаварылка».

Ну, і на дэсерт — радасная навіна. У выпуску «Сямейнай газеты» за 11 чэрвеня расказвалася пра сям'ю Селехаў з Кобрына, сёстры-трайняты з якой рыхтаваліся да выпускнога балю. Матэрыял называўся: «Вера, Надзея, Любоў, іх брат і бацькі».

Нядаўна аўтару, Святлане Яскевіч, пазваніла іх мама Марыя, расказала, што ўсе дзяўчаты паспяхова здалі тэсціраванне і паступілі на бюджэтную форму навучання ў ВНУ. Дзве будуць атрымліваць адукацыю ў Магілёве, адна — у Брэсце. Так што гераіні нашай публікацыі аказаліся не толькі прыгажунямі, але і разумніцамі.

Цяпер у сям'і Селехаў чацвёра студэнтаў (старэйшы іх сын вучыцца ў Мінску). Вядома, бацькам з невялікімі нават па мерках райцэнтра зарплатамі будзе не проста, але яны, упэўнена, справяцца: тут усе прывыклі падтрымліваць адно аднаго. А навaспечаным першакурснікам хочацца пажадаць шчаслівых і цікавых студэнцкіх гадоў ды поспехаў у вучобе

Адказная за выпуск Надзея ДРЫЛА.

РУП «Институт недвижимости и оценки« (Организатор аукциона) по поручению ОАО «Дабрабыт« (Продавец) проводит повторный открытый аукцион

по продаже амбулатории (инв. №621/С-47455) площадью 157,2 м²

и гаража (инв. 621/С-47456) площадью 52,7 м², расположенных по адресу: Минская обл., Несвижский р-н, Ланский с/с, аг. Лань, ул. Советская, 75А.

Земельный участок площадью 0,1093 га с кадастровым номером 624282003601000315. Целевое назначение – обслуживание здания амбулатории. Право постоянного пользования. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Начальная цена с НДС – 131 051 520 бел. руб.
Задаток – 13 105 152 бел. руб. Шаг аукциона – 5%.

Задаток перечисляется на р/с №3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк« ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки«, УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже имущества ОАО «Дабрабыт«, **проводимом 24 сентября 2015 г.**

Договор купли-продажи должен быть заключен в течение 10 (десяти) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Условия оплаты приобретенного на аукционе Объекта согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при заключении договора купли-продажи Объекта. Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 5% (пять процентов) от цены продажи Объекта в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

Аукцион состоится **24.09.2015 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 22.09.2015 до 10.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 6.

Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда« от 11.04.2015. С полным текстом извещения можно ознакомиться на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

☎ Дополнительная информация:
8(017) 306-00-57, 8(029) 356-90-03, 8(029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

Свидетельство о регистрации №100053112 и ПЕЧАТЬ на ЧТУП «БЕЛЭНЕРГОПРОКАТ« **считать недействительными в связи с утерей.**

Страховой полис по добровольному страхованию от болезней и НС на время поездки за границу серии БА № 0643824; по обязательному страхованию ГО владельцев ТС на территории РБ серии ВР № 5427837; квитанцию о приеме денежных средств формы 1СУ серии КС № 3621719, № 4147739 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест« **считать недействительными в связи с утерей.**

Гродненский филиал
РУП «Институт недвижимости и оценки«

ИЗВЕЩАЕТ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ

в объявление о проведении аукциона по продаже имущества Филиала «ГАП № 2 г. Гродно«, назначенного на 24.09.2015 г. следующего содержания: Лот № 1 имеет обременения со стороны 3-х лиц: капитальное строение, инв. № 400/С-60256, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Пучкова, 13, площадью 656,8 кв.м сроком до 31.01.2018 г. УНП 500836025

УНП 190398583

Минский городской центр недвижимости

УП «Минский городской центр недвижимости« сообщает о внесении следующих изменений в графу 7 таблицы извещения о проведении 23 сентября 2015 года открытого аукциона с условиями № 11-У-15 на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) (опубликовано в газете «Звязда« от 19.08.2015):

- цифры «111 961 914« заменяются цифрами «131 892 835«;
- цифры «98 250 264« заменяются цифрами «118 181 185«;
- цифры «124 183 400« заменяются цифрами «144 114 321«;
- цифры «38 237 610« заменяются цифрами «83 124 166«.

Телефон для справок 226-16-72.

■ Імгненні Вялікай вайны

ГРОДНА 100 ГАДОЎ ТАМУ

Узарваны форт гродзенскай крэпасці 1915 г.

Чыгуначны вакзал 03.09.1915 г.

Узарваны мост праз Нёман 02.09.1915 г.

Умацаванне гродзенскай крэпасці 1915 г.

Артылерыйская гармата падарвана пры адыходзе войскаў 1915 г.

Казармы пасля бою 1915 г.

Напярэдадні Першай сусветнай вайны гродзенская крэпасць уяўляла з сябе сістэму абарончых збудаванняў з трынаццаці фартоў і дваццаці чатырох апорных пунктаў, якія размяшчаліся вакол горада.

З набліжэннем фронту і няўдалай абароны крэпасцей Нова-Георгіеўск і Асавец камандаваннем рускай арміі было прынята рашэнне аб знішчэнні фартыфікацыйных збудаванняў на левым беразе Нёмана ў выпадку немагчымасці іх далейшай абароны. Баі за крэпасць пачаліся ў канцы жніўня. Кайзераўскія войскі наступалі з захаду і паўднёвага захаду ў раёне I-V фартоў. Асноўныя баі разгарнуліся за III і IV форты. Паколькі большая частка прыгоннай артылерыі была эвакуявана, рускія, мужна змагаючыся, ужо не маглі трымаць доўгую абарону. Да 1 верасня становішча стала крытычным. Немцы пасля жорсткіх атак авалодалі IV фортам. У сувязі з гэтым рускае камандаванне прыняло рашэнне аб падрыве ўсіх левабярэжных абарончых збудаванняў і адыходзе войскаў на правы бераг Нёмана для абароны горада. У ноч на 2 верасня 1915 года былі падарваны ўсе масты цераз раку. Але ўжо раніцай таго ж дня нямецкія войскі з'явіліся на левым беразе Нёмана, насупраць цэнтра горада, і пачалі наводзіць пантонныя масты для пераправы. Гэтае нечаканае наступленне заспела абаронцаў горада знянацку, завязаўся бой. Нягледзячы на жорсткае супраціўленне, немцам удалося хутка пераправіцца на правы бераг і выціснуць рускіх з горада. Пад пагрозай акружэння апынуліся XII і XIII форты. Каб не дапусціць гэтага і даць магчымасць для адыходу часцей, якія трапілі ў цяжкае становішча, рускім камандаваннем было прынята рашэнне аб контратацы. Раніцай 3 верасня з паўночнага і ўсходняга боку пачаўся штурм горада. Асноўныя баі разгарнуліся ў раёне вакзала, але да гэтага часу галоўныя сілы немцаў ужо паспелі пераправіцца цераз Нёман і, нягледзячы на страты, здолелі ўтрымаць горад.

Але, дзякуючы гэтай атацы, рускія паспелі падарваць правабярэжныя форты і пачаць адход на новыя пазіцыі.

Уладзімір ЛІХАДЗЕДАЎ.
Паштоўкі з калекцыі аўтара

КНІГА ЯК ШЛЯХ ДА ЎЗАЕМАРАЗУМЕННЯ

Учора адкрылася XXVIII Маскоўская міжнародная кніжная выстава-кірмаш, якая на пачатку верасня ў расійскай сталіцы стала традыцыйнай. Яна будзе працаваць у Маскве з 2 па 6 верасня. Спецыяльныя экспазіцыі сведчаць аб шырокім тэматычным дыяпазоне прадстаўленых кніжных навінак. Асобна выдзелены праграмы краін — гасцей выставы («Арменія», «Іран», «Сербія», «Расія літаратурная»). Вылучаецца і дзіцячая праграма. Асаблівая ўвага нададзена праграме «Асвета і адукацыя». Вельмі шмат навінак, якія характарызуюць высокі паліграфічны ўзровень друкарняў і выдавецтваў Расіі і іншых краін СНД.

Беларускі стэнд на выставе даволі прадстаўнічы, у экспазіцыі ўдзельнічаюць вядучыя выдавецтвы нашай краіны — «Беларусь», «Народная асвета», «Вышэйшая школа», «Мастацкая літаратура», «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі», Выдавецкі дом «Звязда», «Пачатковая школа». Безумоўна, асаблівы адбітак на прэзентацыю кніжных навінак беларускіх выдавецтваў накладвае 70-годдзе Вялікай Перамогі. «Мастацкая літаратура» прадставіла нядаўна выдадзеную сумесную кнігу беларускага і расійскага аўтараў Алеся Адамовіча і Данііла Граніна «Блакадная кніга», якая ўжо добра вядома чытачу. Выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» прапанавала цэлы спектр кніг ваеннага гісторыка Барыса Далгатовіча.

Выдавецкі дом «Звязда» прадставіў альбом «Мая вайна» Васіля Ракашава, франтавога фотакарэспандэнта газеты «Красноармейская правда» (так у час Вялікай Айчыннай называлася «Беларусская военная газета», якую выпускалі на Заходнім, а пасля — на 3-м Беларускім фронце).

Несумненна, пагарталі гэтую кнігу, якая яскрава адлюстроўвае ўвесь трагізм, увесь драматычны характар Вялікай Айчыннай вайны, і расійскія наведвальнікі выставы-кірмашу, і тыя, хто прыехаў на кніжны форум з іншых краін. У гэтым альбоме ёсць і здымкі франтавога карэспандэнта маёра, а пасля падпалкоўніка Аляксандра Твардоўскага, які ў «Красноармейской правде» надрукаваў паэму «Василий Тёркин». Зацікаўленасць чытачоў выклічуць і кнігі сучасных беларускіх аўтараў. На выставе прадстаўлены серыя «Бібліятэка Саюза пісьменнікаў Беларусі» і мастацкія творы аўтараў іншых краін, перакладзеныя на беларускую мову самымі вядомымі айчыннымі паэтамі і празаікамі.

Асобна выдзяляецца цэлая падборка кніг серый «Созвучие» и «Созвучие сердец» (гэта літаратурна-мастацкія праекты, якія паказваюць аўтараў Расіі і Беларусі), а таксама палітра кніг, што прадстаўляюць кітайскую літаратуру на беларускай мове. Сярод іх — серыя арыгінальных паэтычных зборнікаў «Светлыя знакі: паэты Кітая», выдадзеная ў Выдавецкім доме «Звязда». Тут прадстаўлены класікі кітайскай паэзіі Ван Вэй, Ду Фу, Лі Бо, Ай Цін. Гэтая серыя зацікавіла ўдзельнікаў выставы з Кітая, і можна спадзявацца, што нашы выдаўцы прывязуць з Масквы новыя прапановы, заключаць новыя пагадненні па аўтарскіх правах на прадстаўленне кітайскай паэзіі, найперш — сучасных аўтараў у Беларусі.

Шмат на беларускім стэндзе дзіцячых кніг, прадстаўлена нямала адукацыйных праектаў, асабліва ў гэтым плане вылучаюцца выдавецтвы «Народная асвета» і «Вышэйшая школа».

У дзень адкрыцця Маскоўскай міжнароднай выставы-кірмашу ў Пасольстве Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі прайшоў «круглы стол» «Беларусь — Расія: агульны погляд у будучыню».

Адкрываючы яго, міністр інфармацыі Беларусі Лілія Ананіч падкрэсліла асаблівы характар беларуска-расійскага адзінства, заклікала зазірнуць не толькі ў мінулае, але і ў сучаснасць і падумаць пра будучыню нашых сумесных інтэграцыйных праектаў у сферы міжнацыянальнага супрацоўніцтва. Агульная культурная прастора — крокі да разумення адно аднаго. І каб гэтыя крокі былі істотнымі, варта пастаянна думаць аб канкрэтных перспектывах яе фарміравання, думаць пра тое, як будзе выглядаць інфармацыйнае грамадства XXI стагоддзя і якое культурнае багацце нашых народаў мы пакінем нашчадкам.

Маскоўская міжнародная выстава-кірмаш — традыцыйнае месца сустрэчы пісьменнікаў з розных краін. Асабліва шмат кантактаў з пісьменнікамі краін СНД ля беларускага стэнда. Цікавасць да беларускай кнігі праяўляюць і госці з Азербайджана на чале з вядомым паэтам Чынгізам Алі аглу, і госці з Арменіі на чале са старшынёй нацыянальнага саюза пісьменнікаў Арменіі Эдвардам Мілітанянам, і іншыя.

А калі ёсць такі інтарэс, будуць і новыя кнігі, і новыя сумесныя творчыя праекты, якія сведчаць аб дружбе і ўзаемаразуменні.

Кастусь ЛАДУЦЬКА.
Масква — Мінск.

РУП «Жилкоммунтехника» (Организатор аукциона) ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА СО СНИЖЕНИЕМ ЦЕНЫ по продаже имущества, принадлежащего РУП «Жилкоммунтехника» (Продавец):

ЛОТ №1 – комплекс зданий, сооружений, передаточных устройств с оборудованием. Адрес: Могилевская обл., Осиповичский р-н, г. Осиповичи, ул. Проектируемая, д. 14.

Начальная цена лота №1 с НДС – 1 752 992,25 доллара США.
Задаток – 87 649,6 доллара США.

ЛОТ №2 – гостиница с инв. №714/D-11556. Адрес: Могилевская обл., Осиповичский р-н, г. Осиповичи, ул. 60 лет Октября, д. 15.

Начальная цена лота №2 с НДС – 92 340 долларов США.
Задаток – 4 617 долларов США.

Задаток перечисляется на р/с 3012001673822 в ЦБУ №538 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, ул. Коржа, 11А, код 369. Получатель – РУП «Жилкоммунтехника», УНП 100135569. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже имущества РУП «Жилкоммунтехника» (Лот №__), **проводимом 21 сентября 2015 г.**

Участник торгов, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере, установленном для лота с наибольшей начальной ценой.

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Лот №1 и (или) Лот №2 по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Лота №1 и (или) Лота №2 в течение 10 (десяти) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Валюта торгов – доллар США.

Валюта платежа – белорусский рубль.

Сумма для оплаты задатка за участие в аукционе производится в белорусских рублях с применением официального курса Национального банка Республики Беларусь на день платежа.

Условия оплаты приобретенного на аукционе Лота №1 и (или) Лота №2 согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при заключении договора купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона.

Сумма для оплаты Объекта производится в белорусских рублях с применением официального курса Национального банка Республики Беларусь на день платежа.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение повторного открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Для Лота №1 условием является сохранение количества рабочих мест на момент заключения договора купли-продажи Лота №1 (по состоянию на 1 сентября 2015 г. среднесписочная численность работников 9 чел.).

Аукцион состоится **21.09.2015 в 10.00** по адресу: г. Минск, ул. Кальварийская, д. 25, 2 этаж, каб. 209. Шаг аукциона – 5%. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 17.09.2015 до 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Кальварийская, д. 25, 2 этаж, каб. 209.

Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 03.04.2015.

☎ Организатор аукциона: РУП «Жилкоммунтехника»: 8 (017) 204 71 51, 8 (029) 698 51 76 • e-mail: jkt@tut.by

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 6 октября 2015 г. повторных торгов по продаже конфискованного имущества

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)		
Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества	**Начальная цена, бел. руб.**	**Размер задатка, бел. руб.**
Земельный участок с кадастровым номером 622087800001000129 площадью 0,1032 га, расположенный по адресу: Минская обл., Воложинский р-н, Садоводческое товарищество «Весна» (категория: земли населенных пунктов, садоводческих товариществ, дачных кооперативов; целевое назначение: земельный участок для садоводства в садоводческом товариществе «Весна»)	17 638 600	1 763 000

Организатор аукциона – УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, представившие организатору аукциона следующие документы:

